S T U D I A

Мікола Волкаў
https://orcid.org/0000-0003-1840-4145
Еўрапейскі гуманітарны універсітэт

Максім Макараў
https://orcid.org/0000-0003-4587-461X
Мінск

# Віцебскія замкі ў XIV – першай палове XVII ст.: архітэктура і соцыум[1]

**Анатацыя**
У артыкуле зроблена спроба на падставе пісьмовых крыніц і вынікаў археалагічных раскопак аднавіць першапачатковы выгляд Віцебскіх мураваных замкаў XIV ст. і разгледзець трансфармацыю іх архітэктуры, сістэмы будаўніцтва і рамонта ўмацаванняў у перыяд да сярэдзіны XVII ст. Таксама аналізуюцца сацыяльная структура насельніцтва Віцебскіх замкаў і функцыянаванне службаў, звязаных з іх забеспячэннем неабходнымі рэсурсамі і паслугамі.

**Abstract**
Based on the written sources and the results of archaeological excavations, the article examines the initial appearance of Viciebsk masonry castles in the fourteenth century and their transformation up to the mid-seventeenth century. In addition to the architecture, the study explores the system of construction and repair of fortifications, the social structure of the castle population, and the functioning of services related to their provision of necessary resources and utilities.

**Ключавыя словы**: замак, рэзідэнцыя, фартэцыя, фартыфікацыя, Віцебск, Беларускае Падзвінне, Вялікае Княства Літоўскае

**Keywords**: castle, residence, fortress, fortification, Viciebsk, Belarusian Podvine, Grand Duchy of Lithuania

[1] За дапамогу ў працы над артыкулам і шматлікія кансультацыі выказваем шчырую ўдзячнасць Таццяне Станіславаўне Бубенька. М. Волкаў выконваў працу над артыкулам у рамках стажыроўкі пры Інстытуце мастацтва Польскай акадэміі навук пры падтрымцы Нацыянальнага агенцтва акадэмічных абменаў.

CC BY

http://doi.org/10.12775/RL.2024.10.01

Зручнае геаграфічнае размяшчэнне і наяўнасць мураваных умацаванняў зрабілі Віцебск у XIV–XVII стст. надзвычай моцнай і важнай фартэцыяй. У канстытуцыі сойма Рэчы Паспалітай 1654 г., складзенай у атмасферы чакання новай вайны з Маскоўскай дзяржавай, было запісана: "Siła Rzpltey na zamku Witepskim należy"[2]. На жаль, да цяперашняга часу віцебскія мураваныя замкі амаль цалкам страчаны, а рэльеф мясцовасці на абшары, дзе яны размяшчаліся, у значнай ступені зменены. Нават уявіць сабе, як выглядаў адзін з найбольш значных абарончых комплексаў ВКЛ, праблематычна.

Да таго ж ВКЛ, якое з 1569 г. знаходзілася ў складзе Рэчы Паспалітай, за азначаны час прайшло доўгі шлях эвалюцыі, што аказвала непасрэдны ўплыў на ўмовы існавання ўмацаванняў. Мураваныя замкі пачалі ўзводзіцца пры Альгердзе, для якога Віцебск быў вотчынным уладаннем. У другой палове XVI – першай палове XVII ст. яны страцілі рэзідэнцыянальную функцыю і ва ўмовах выбарнай манархіі і пашырэння шляхецкай дэмакратыі выступалі як дзяржаўная фартэцыя, клопат аб падтрыманні якой у належным стане быў ускладзены на мясцовае насельніцтва. Гэтыя трансфармацыі мянялі ўяўленне пра замак ў грамадстве і наклалі істотны адбітак на сістэму будаўніцтва і забеспячэння ўмацаванняў, ад чаго моцна залежаў іх абарончы патэнцыял.

У артыкуле на падставе пісьмовых крыніц і вынікаў археалагічных раскопак зроблена спроба аднавіць першапачатковы выгляд Віцебскіх мураваных замкаў XIV ст. і разгледзець трансфармацыю іх архітэктуры да 1654 г. Верхняя храналагічная мяжа даследавання абумоўлена тым, што фартэцыя была здабыта маскоўскімі войскамі і за наступныя 10 гадоў грунтоўна перабудавана. Пазней яе ваеннае значэнне няўхільна зніжалася. Акрамя архітэктуры комплекса, сістэмы будаўніцтва і рамонта ўмацаванняў, нас цікавіць сацыяльная структура насельніцтва Віцебскіх замкаў і функцыянаванне службаў, звязаных з іх забеспячэннем неабходнымі рэсурсамі і паслугамі[3].

На Віцебскія замкі гісторыкі звярнулі ўвагу дастаткова рана. Першае спецыяльнае даследаванне, прысвечанае ім, выйшла з друку ў 1881 г.[4] Важнае

---

[2] VL, t. 4, Petersburg 1854, s. 218.

[3] Пытанні, звязаныя з ваенным патэнцыялам Віцебскіх замкаў, неаднаразова разглядаліся ў навуковай літаратуры, таму ў рамках дадзенага артыкула яны не закранаюцца. Па гэтай тэме гл.: М.А. Ткачев, *Белорусский феодальный город XIV–XVIII веков (структура и организация обороны). Диссертация на соискание ученой степени доктора исторических наук*, Гродно 1985, с. 124–152; М.Дз. Макараў, *Ад пасада да магдэбургіі. Прававое становішча насельніцтва местаў Беларускага Падзвіння ў XIV – першай палове XVII ст.*, Мінск 2008, с. 82–93; М.А. Волкаў, *Арсеналы замкаў у Беларускім Падзвінні ў XVI–XVII стст.*, в: *Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі: матэрыялы VIII Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Полацк, 1–2 лістапада 2022 г.)*, Полацк 2022, с. 67–79; M. Volkau, *Zamki i drogi na białoruskim Podźwiniu w czasie wojny inflanckiej (1558–1583)*, "Zapiski Historyczne" 88, 2023, z. 3, s 37–53.

[4] А.П. Сапунов, *Исторические сведения о витебских замках*, в: *Памятная книжка Витебской губернии на 1881 год*, Витебск 1881, с. 143–176.



1. Верхні замак у Віцебску на чарцяжы 1664 г. РГАДА, ф. 192, оп. 1, Витебская губ., № 2.

значэнне мела публікацыя А.П. Сапуновым у 1880-я гг. трох тамоў зборніка дакументаў “Витебская старина”, якія ўтрымлівалі некалькі апісанняў замкаў[5]. Істотным стымулам для развіцця тэмы стала адкрыццё так званага “Чарцяжа горада Віцебска 1664 г.”(іл. 1)[6]. У другой палове XX ст. на тэрыторыі замкаў праводзіліся археалагічныя даследаванні, вынікі якіх прадстаўлены ў працах М.А. Ткачова, В.М. Ляўко, Т.С. Бубенькі і Л.У. Калядзінскага[7].

[5] *Витебская старина*, т. 1, 4, 5, сост. и изд. А.П. Сапунов, Витебск 1883, 1885, 1888.

[6] Российский государственный архив древних актов, ф. 192, оп. 1, Витебская губ., № 2; А.П. Сапунов, *“Чертеж” гор. Витебска 1664 года*, Витебск 1910; У.Г. Краснянскі, *“Чарцёж” места Віцебска 1664 года як дакументальны помнік да гісторыі беларускага драўлянага будаўніцтва*, Менск 1928.

[7] У першую чаргу адзначым абагульняючыя працы: М.А. Ткачев, *Белорусский феодальный город XIV–XVIII веков…*; *idem*, *Замки Белоруссии*, Минск 1987; Т.С. Бубенько, *Средневековый Витебск. Посад – Нижний замок (X – первая половина XIV в.)*, Витебск 2004; О.Н. Левко, *Витебск*, Минск 2010; Л.В. Колединский, *Верхний замок Витебска (IX–XVIII вв.)*, Гродно 2021.

Аднак, магчымасці археалогіі для даследавання Віцебскіх замкаў у эпоху ВКЛ дастаткова абмежаваныя, паколькі значная частка культурных напластаванняў разам з рэшткамі пабудоў была знішчана ў XIX–XX стст. Таму пры апісанні іх гісторыі і архітэктуры даследчыкі абапіраліся, у тым ліку, на пісьмовыя крыніцы, а найбольш у гэтым плане зрабіў М.А. Ткачоў.

Сістэмная праца з інвентарнымі апісаннямі і актавым матэрыялам дазваляе прасунуцца ў справе вывучэння Віцебскіх замкаў значна далей. На сёння выяўлены і апублікаваны чатыры падрабязныя апісанні віцебскіх умацаванняў XVII ст.: інвентары 1638[8] і 1639 гг.[9], апісанні зробленыя маскоўскімі ваяводамі ў 1655[10] і 1665–1666 гг[11]. Усе гэтыя дакументы арыгінальныя і не капіруюць тэкст адзін з аднаго, што дазваляе параўноўваць і верыфікаваць апісанні асобных будынкаў, і, адпаведна, максімальна дакладна рэканструяваць выгляд замкаў. У інвентары 1638 г. прадстаўлены каштоўныя звесткі пра шэраг старажытных мураваных элементаў замкаў, якія ў другой палове XVII ст. ўжо не існавалі. У той жа час, прыведзеныя ў дакуменце абмеры нельга назваць дакладнымі: тут выкарыстаны такія адзінкі вымярэння даўжыні, як крок і сажань, але часцей за ўсё падаецца толькі іх прыблізная колькасць. Інвентар 1639 г. значна больш лаканічны, у ім згадваюцца толькі асобныя цікавыя дэталі, а абмеры адсутнічаюць. У сваю чаргу, апісанні 1655 і 1665–1666 гг. утрымліваюць паслядоўныя і сістэматычныя абмеры замкавых умацаванняў у сажанях[12]. У гэтых апісаннях памеры асобных элементаў нярэдка адрозніваюцца, што вынікала з пэўнай хібнасці вымярэнняў, а таксама змен у архітэктуры ўмацаванняў. З іншага боку, гэта сведчыць, што праводзіліся два асобныя абмеры, даныя якіх мы можам супастаўляць і параўноўваць. На падставе гэтых чатырох крыніц з улікам згаданага вышэй чарцяжа 1664 г., мы атрымліваем унікальную магчымасць рэканструяваць першапачатковы выгляд комплекса. Важнае значэнне для гэтае працы мае план Віцебска, выкананы ў 1797–1802 гг. (іл. 2)[13], на якім добра бачны абрысы замкаў. Яго прывязка да сучаснай тапаграфічнай сітуацыі пры дапамозе геаінфармацыйнай

[8] М.Д. Макараў, М.А. Волкаў, *Інвентар замка і горада Віцебска 1638 г.*, „Архіварыус" 18, 2020, с. 28–58.

[9] W. Mikulski, J. Zawadzki, *Opisy zamków białoruskich z inwentarzy dóbr przechowywanych w Archiwum Radziwiłłów w Archiwum Głównym Akt Dawnych*, Warszawa 1999, s. 27–31.

[10] *Витебская старина...*, т. 4, с. 314–317.

[11] *Ibidem*, с. 321–339.

[12] Ужываўся т. зв. казённы сажань, пра што сведчыць прамая згадка ў апісанні 1665 г. – "государева трехаршинная сажень". Даўжыня казённага сажня складала 2,16 м. Гл.: Н.А. Шостьин, *Очерки истории русской метрологии: XI – начало XX века*, Москва 1975, с. 55.

[13] Ю.В. Чантурия, *Белорусское градостроительное искусство: средневековое наследие, ренессанс, барокко, классицизм в системе европейского зодчества*, Минск 2017, с. 89.



2. Тэрыторыя замкаў у Віцебску ў канцы XVIII – пачатку XIX ст. Ю.В. Чантурия, Белорусское градостроительное искусство: средневековое наследие, ренессанс, барокко, классицизм в системе европейского зодчества, Минск 2017, с. 89.

сістэмы QGIS дазваляе выкарыстаць метрычныя даныя з інвентароў і апісанняў для лакалізацыі асобных архітэктурных аб'ектаў і рэканструкцыі планіроўкі замкаў.

## Архітэктура замкаў у XIV ст.: спроба рэканструкцыі

Дрэваземляныя ўмацаванні, што вызначылі перыметр пазнейшага Верхняга замка Віцебска, былі ўзведзены ў 1130–1140-я гг. Магутны вал у форме падковы, які сваімі канцамі абапіраўся на старажытнае гарадзішча, вядомае з пазнейшых крыніц пад назвамі Замкавая гара, ці Ламіха, ахапіў частку пасадскай тэрыторыі паміж гарадзішчам, рэкамі Дзвіной і Віцьбай. У выніку, у склад віцебскага "града" акрамя Замкавай гары была ўключана паўночная частка Дзвінскага ўзвышша і нізіна паміж імі. Як сведчаць матэрыялы

археалагічных раскопак, насыпаны ў XII ст. вал меў драўляную субструкцыю, выкананую ў перакладной тэхніцы. Яе шырыня ля падэшвы складае каля 15 м, а вышыня захаванай у зямлі і вывучанай археалагічна часткі – не менш за 5,7 м[14]. Па ўсёй верагоднасці, першапачаткова драўляная субструкцыя і, адпаведна, вал былі вышэйшымі. Пра земляны вал па лініі ўмацаванняў Верхняга замка часта згадваецца ў крыніцах XVII – пачатку XVIII ст.[15], у тым ліку, ў інвентарах 1638 і 1639 гг. Пры гэтым у першым было адзначана, што вал быў "niemałym sumptem wysoko usypany". Таму цалкам магчыма, што ў другой палове XVI – першай палове XVII ст. яго падсыпалі. Пляцоўка пазнейшага Ніжняга замка была заселена са старажытнарускага часу, аднак выявіць умацаванні гэтага перыяду ўздоўж яе края як ва ўсходняй, так і ў заходняй частцы комплекса археолагам не ўдалося[16].

У навуковай літаратуры будаўніцтва мураваных замкаў у Віцебску звычайна звязваецца з дзейнасцю Альгерда, які праз шлюб з дачкой апошняга мясцовага ўдзельнага князя ў 1320–1330 гг. стаў вотчынным уласнікам горада. Існуе меркаванне, што будаўнічыя працы маглі распачацца пасля пажара 1335 г[17]. Аднак, Т.С. Бубенька на падставе вывучэння рэшткаў мураваных сцен Ніжняга замка пераканаўча сцвярджае, што згаданы пажар толькі прыпыніў будаўніцтва, якое распачалося раней[18]. Аб часе завяршэння асноўных прац па ўзвядзенні мураваных умацаванняў сведчыць "Хроніка літоўская і жамойцкая": "Року 1351. Замок Витебский и вежу змуровала Улияна княгиня, жона Олгердова, в небытности Олгерда, гды был на войнѣ пруской, также и палац от Нижнего замку праве вспанялый велми, и муром округ обвела з баштами вынеслыми и вежами"[19]. Аб узвядзенні мураванага Верхняга замка менавіта пры Альгердзе пісаў таксама Мацей Стрыйкоўскі[20].

Комплекс захаваных пісьмовых і іканаграфічных крыніц дазваляе ўявіць, як выглядалі Віцебскія замкі ў XIV–XV стст. (іл. 3–4). Важнейшым абарончым элементам Верхняга замка з'яўлялася брама. У шэрагу апісанняў выразна адзначана, што першая замкавая брама мела форму вежы і знаходзілася

---

[14] О.Н. Левко, *Границы Верхнего и Нижнего замков на современном плане города Витебска по архивно-археологическим исследованиям*, "Матэрыялы па археалогіі Беларусі" 2019, № 30, с. 111; Л.В. Колединский, *Верхний замок Витебска (IX–XVIII вв.)...*, с. 54; *idem*, *Верхний замок Витебска – уникальный археологический объект (изучение и сохранение)*, "Беларуская думка" 2022, № 6, с. 87.

[15] *Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской* (далей: *ИЮМ*), т. 21, Витебск 1891, с. 184; *ИЮМ*, т. 26, Витебск 1895, с. 438.

[16] Т.С. Бубенько, *op. cit.*, с. 30–31.

[17] В. Варонін, *Княжанне Альгерда ў Віцебску*, "Беларускі гістарычны часопіс" 2013, № 7, с. 9.

[18] Т.С. Бубенько, *op. cit.*, с. 32.

[19] *Полное собрание русских летописей*, т. 32: *Хроники: Литовская и Жмойтская, и Быховца. Летописи: Баркулабовская, Аверки и Панцырного*, Москва 1975, с. 45.

[20] M. Stryjkowski, *Kronika polska, litewska, żmódzka i wszystkiej Rusi*, t. 2, Warszawa 1846, s. 14.

пасярэдзіне заходняга прасла сцяны з боку Дзвіны. Так, у інвентары 1638 г. гаворыцца аб браме "niegdy wiezney, ale teraz dla wysokosci gury zaniechaney, ktora stoi nad Dwiną". У інвентары 1639 г. яна названа "вялікай". А ў апісанні 1655 г. чытаем аб "каменной башни, а въ ней бывали ворота, а нынѣ та башня разволилася". Паводле гэтага апісання, яе шырыня складала 11,9 м (5½ саж.). Паколькі гэты будынак знаходзіўся высока над Дзвіной (неабходна памятаць пра тое, што ўся заходняя лінія ўмацаванняў Верхняга замка праходзіла па грэбні вала XII ст. на стромым беразе ракі), да яго падводзіў мост. У 1495 г. вялікі князь маскоўскі Іван III у сваёй інструкцыі баярам, што суправаджалі яго дачку Алену да будучага мужа, вялікага князя літоўскага Аляксандра Ягелончыка, ахарактарызаваў тагачасны стан гэтага маста як ненадзейны: "Да в Витебску деи мостъ городной худъ; и будет лзѣ ей быти у соборные церкви, и ей быти; а будетъ нелзѣ, и ей не быти". Тым не менш, Алена Іванаўна праехала па згаданым мосце "къ веръхънему городку" і ў ім начавала[21]. У крыніцы, якая датуецца 1538 г. гэты мост выступае пад назвай "Высокий"[22]. Такім чынам, брама над Дзвіной выкарыстоўвалася, па меншай меры, да сярэдзіны XVI ст. Гэтым тлумачыцца і той факт, што памяць пра яе першаснае прызначэнне захоўвалася да сярэдзіны XVII ст. Мост, што пачынаўся ад брамы, павінен быў паварочваць на поўдзень і ісці ўздоўж замкавых муроў (па-за перыметрам умацаванняў) у кірунку рынкавай плошчы, што знаходзілася ля Дабравешчанскай царквы. Да ўмацаванняў Ніжняга замка мост мусіў падыходзіць прыблізна ў тым месцы, дзе ў XVII ст. ужо стаяла Жыдоўская форта, ці брама.

Размяшчэнне галоўнага ўезду ў Верхні замак з боку Дзвіны істотна ўскладняла камунікацыю з Ніжнім замкам, аднак абгрунтоўвалася патрэбамі абароны. Брама – самае слабое месца у абарончым перыметры замка, і таму яе наўмысна пераносілі на найбольш недаступны для непрыяцеля бок умацавання. Падобнае вырашэнне пытання мы бачым у збудаваных у той жа перыяд замках у Горадні і Навагрудку[23]. Ва ўсіх трох згаданых замках мост ішоў уздоўж лініі баявой галерэі і падводзіўся да брамы так, што ў ходзе

---

[21] *Сборник Императорского Русского Исторического Общества*, т. 35: *Памятники дипломатических сношений древней России с державами иностранными. 1. Памятники дипломатических сношений Московского государства с Польско-Литовским государством в царствование великого князя Ивана Васильевича*, ч. 1: *Годы с 1487 по 1533*, Санкт-Петербург 1882, с. 167, 183–184.

[22] *Судебная книга витебского воеводы, господарского маршалка, волковыского и оболецкого державцы М.В. Клочко. 1533–1540 (Литовская метрика. Книга № 228. Книга судных дел № 9)*, публ. подгот. В.А. Воронин, А.И. Груша, И.П. Старостина, А.Л. Хорошкевич, Москва 2008, с. 119.

[23] М. Волкаў, *Архітэктура Старога замка часоў Вітаўта ў Гародні*, "Беларускі гістарычны часопіс" 2014, № 2, с. 22, 24–25.

атакі на яе непрыяцельскі воін не меў магчымасці прыкрывацца тарчай, якую звычайна трымалі ў левай руцэ. Такім чынам, мы бачым добра прадуманы і дастаткова распаўсюджаны ў ВКЛ у XIV ст. фартыфікацыйны прыём.

Як сведчаць апісанні XVII ст., з паўночнага і паўднёвага бакоў да першай брамы віцебскага Верхняга замка прылягалі праслы мураваных сцен. Даўжыня паўночнага фрагмента заходняга муру, паводле апісання 1655 г., складала 44 м (20,5 саж.), далей ішлі 16 м драўляных умацаванняў (7½ саж.) да "нарожнай" драўлянай вежы. У апісанні 1665 г. даўжыня гэтага прасла складала 63 м (29 саж.). На поўдзень ад брамы адыходзіла сцяна даўжынёй 52–59 м (1655 г. – 24 саж., 1665 г. – 27¼ саж.). Да сярэдзіны XVII ст. мур, што прымыкаў да брамы з поўдня, захоўваўся амаль цалкам, меў у вышыню 4,9 м (1665 г. – 2¼ саж.) і завяршаўся зубцамі. У 2004 г. у ходзе археалагічныхназіранняў, што праводзіліся пад кіраўніцтвам В.М. Ляўко, на беразе Дзвіны паміж будынкам драматычнага тэатра і Кіраўскім мастом, а таксама пад праезжай часткай сучаснай вуліцы Замкавай былі выяўлены рэшткі мураваных канструкцый XIV ст[24]. Верагодна, іх варта звязваць са згаданым паўднёвым праслам заходняга муру Верхняга замка.

На паўднёва-заходнім вуглу абарончага перыметра Верхняга замка стаяла прамавугольная "нарожная" вежа, да якой падыходзіў таксама мур Ніжняга замка. У актах XVI ст. гэта вежа згадваецца як Прачысценская[25]. Верагодна, менавіта яе апісаў М. Стрыйкоўскі, які пабачыў Віцебск у 1573 г.: "wieża murowana ku Dźwinie, Wyszny zamek murowany z Niżnym drzewianym złączająca, której i dziś połowa przez Witołda odbita i prawie odcięta stoi"[26]. У сярэдзіне XVII ст. гэтая вежа працягвала стаяць напаўразбуранай: сцяны з боку дзядзінца ўжо не было, а сцены са знешняга боку захаваліся. Як вынікае з абмераў 1665 г., яна выступала за перыметр умацаванняў на 4,3 м (2 саж.), а яе вонкавая сцяна мела даўжыню 10,8 м (1655, 1665 гг. – 5 саж.). Паводле чарцяжа 1664 г., нават у напаўразбураным стане вежа захоўвалася на значную вышыню і мусіла налічваць не менш за 3 паверхі. Акрамя фланкіравання сумежных сцен з вежы добра прастрэльваўся мост, што вёў з Ніжняга замка да галоўнай брамы Верхняга замка.

Ад згаданай вежы па грэбні вала XII ст. ва ўсходнім кірунку ішоў мур агульнай даўжынёй 153–155 м (1655 г. – 71 саж., 1665 г. – 72 саж.), які прыкрываў Верхні замак з паўднёвага боку. Да 1660–х гг. яшчэ стаялі значныя яго фрагменты вышынёй 7–7,6 м (1655 г. – 3¼ саж., 1665 г. – 3½ саж.), што завяршаліся зубцамі. На чарцяжы 1664 г. бачна, што зубцы

---

[24] О.Н. Левко, *Границы Верхнего и Нижнего замков...*, с. 112, 116–117.

[25] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей: *НГАБ*), ф. КМФ-18, воп. 1, спр. 60, арк. 22 адв. – 23.

[26] M. Stryjkowski, *op. cit.*, s. 109.




3. Віцебскія замкі ў другой палове XIV ст. Рэканструкцыя П. Татарнікава па матэрыялах М. Волкава і М. Макарава, 2021 г.




4. Віцебскія замкі ў другой палове XIV ст. Рэканструкцыя П. Татарнікава па матэрыялах М. Волкава і М. Макарава, 2021 г.

на гэтым участку мелі вузкія байніцы-прарэзы. Паводле крыніц XVII ст., прыблізна пасярэдзіне гэтага прасла існаваў адрэзак, на якім разбураныя мураваныя ўмацаванні былі заменены на драўляныя. Згодна з апісаннем 1665 г., ад Прачысценскай вежы ішло 45 м муру (21 саж.), затым драўляныя ўмацаванні разам з вежай-брамай на 31–35 м (1655 г. – 16 саж., 1665 г. –

14¼ саж.). У апошнія дзесяцігоддзі XVI – XVII ст. брама ў гэтым месцы згадваецца і як галоўны ўезд у замак. Першая згадка пра яе ў захаваных крыніцах датуецца 1592 г[27]. Аднак, можна ўпэўнена сцвярджаць, што яна з’явілася не раней за сярэдзіну XVI ст., бо наяўнасць дзвюх вялікіх брам значна аслабіла б абарону ўмацавання, а да гэтага часу працягвала функцыянаваць першая замкавая брама з боку Дзвіны. Адрэзак муру, на месцы якога пазней з’явілася драўляная вежа-брама, мог быць разбураны ў 1393 г., калі Віцебск штурмавалі войскі Вітаўта. Па словах М. Стрыйкоўскага, яны здабывалі Верхні замак з дапамогай артылерыі з боку мураванай Дабравешчанскай царквы: “zasadziwszy działa u cerkwie murowanej na Niżnym zamku w mocnych szańcach, tłukł mury Wysznego zamku we dnie i w nocy bez przestanku”[28]. Таму, верагодна, у гэтым месцы быў зроблены пралом для штурма, які пазней закрылі больш простымі драўлянымі ўмацаваннямі, а пазней перанеслі сюды галоўную браму.

Паводле інвентара 1638 г., сваім усходнім краем згаданая сцяна прымыкала да “baszty, gdzie znać y pałace krolewskie były”. У інвентары 1639 г. рэшткі гэтага будынку фігуруюць як “pałace królewskie w murze”, а ў маскоўскіх апісаннях – як “полата”. На чарцяжы 1664 г. бачна, што гэта было вежападобнае збудаванне з трыма ярусамі. Пры гэтым, у апісанні 1665–1666 гг. згадваюцца вокны, што сведчыць аб наяўнасці ў будынку жылых і рэпрэзентацыйных памяшканняў. У 1573 г. рэшткі згаданага “палаца” пабачыў М. Стрыйкоўскі, які адзначыў, што ад яго засталася толькі “ściana jedna gwałtowna ze wschodami”[29]. Згодна з апісаннямі XVII ст., гэтая сцяна не выступала за перыметр замкавых умацаванняў, а яе даўжыня складала 19,4–21,6 м (1655 г. – 9 саж., 1665 г. – 10 саж.). У навуковай літаратуры выказваліся меркаванні, што ў дадзеным выпадку мы маем справу з жылым рэпрэзентацыйным вежападобным будынкам тыпу “данжон”[30]. Варта адзначыць, што бліжэйшым аналагам віцебскага “палаца” з’яўляецца Княская вежа Крэўскага замка, якая, да таго ж, мае падобныя габарыты – 18,65 x 17 м[31]. Заўважым, што Віцебск і Крэва былі вотчыннымі ўладаннямі Альгерда,

---

27 *ИЮМ*, т. 20, Витебск 1890, с. 498. Тое, што размова ідзе менавіта пра новую драўляную браму ў згаданым месцы можна даказаць наступным чынам: у дакуменце 1592 г. гаворыцца пра двор шляхціцаў Войнаў, які і паводле дакумента і паводле інвентара 1638 г., быў размешчаны адразу за гэтай брамай.

28 M. Stryjkowski, *op. cit.*, s. 109.

29 *Ibidem*, s. 58.

30 Ю.А. Якимович, *Зодчество Белоруссии XVI – середины XVII в.: справочное пособие*, Минск 1991, с. 60; Ю.М. Бохан, *Вайсковая справа ў Вялікім княстве Літоўскім у другой палове XIV – канцы XVI ст.*, Мінск 2008, с. 423.

31 М. Макараў, *Да пытання пра выкарыстанне тэрміну “данжон” (donjon) у беларускай гістарычнай літаратуры*, “Гістарычны альманах” 5, 2001, с. 66; Ю.М. Бохан, *op. cit.*, с. 426.

таму верагоднасць рэалізацыі падобных архітэктурных канцэпцый у абодвух замках з'яўляецца вельмі высокай[32].

У 1977 г. на паўночным баку сучаснай вуліцы Замкавай насупраць уваходу ва ўнівермаг у будаўнічай яме, зробленай пад ліхтарны слуп, былі выяўлены рэшткі складзенай з буйных валуноў сцяны XIV ст. Як паказваюць матэрыялы раскопак, лінія дрэваземлянога вала XII ст. на гэтым адрэзку ішла па супрацьлеглым паўднёвым боку вуліцы Замкавай[33], а выяўлены мур знаходзіўся на адлегласці 18–20 м (прамеры Т.С. Бубенька) ад яго грэбня. У сувязі з гэтым, В.М. Ляўко нават выказала меркаванне, што лініі мураваных умацаванняў Верхняга замка і старажытнарускага вала не супадалі[34]. Аднак, на наш погляд, размяшчэнне абарончай сцяны ля падэшвы вала з яго ўнутранага боку супярэчыць логіцы. Можна асцярожна дапусціць, што выяўленыя канструкцыі з'яўляюцца рэшткамі тыльнай сцяны "данжона", якая, з улікам ўсяго, што вядома пра размяшчэнне і габарыты будынка, мусіла быць аднесена прыблізна на 20 м ад фронта ўмацаванняў у бок замкавага двара.

За вежападобным палацам лінія мураваных сцен Верхняга замка ішла далей на паўночны ўсход уздоўж края пляцоўкі Замкавай гары да вежы, вядомай пад назвай Круглік. Працягласць гэтага адрэзка складала 132–141 м (1655 г. – 61 саж., 1665 г. – 65½ саж.). Да сярэдзіны XVII ст. мураваная сцяна захоўвалася па ўсёй яго даўжыні, аднак была ўжо у значнай ступені разбурана, у тым ліку, страчаны зубцы ў яе завяршэнні. Як сведчыць апісанне 1655 г., асобныя фрагменты канструкцый з камянёў і цэглы ўзвышаліся тут на 4,3 м (2 саж.). Ля падэшвы Замкавай гары на гэтым адрэзку ўмацаванняў Верхняга замка існавала "балотца", якое неаднаразова фіксуецца ў актавым матэрыяле XVII ст[35]. Па археалагічных дадзеных, яно ўтварылася на месцы дастаткова глыбокага рова, што некалі бараніў падыходы да старажытнага гарадзішча з усходу, але быў засыпаны яшчэ ў эпоху Ранняга сярэднявечча[36].

Перад самым Круглікам у лініі замкавых умацаванняў знаходзілася брама ці фортa, кшталту простага праёма ў сцяне. Згодна з дакументам, што датуецца чэрвенем 1626 г., з усходняга боку да яе можна было трапіць праз "мост стародавний Юревский" (верагодна, перакінуты праз згаданае вышэй "балотца"), па якім "з давных часовъ просто на гору до замку Вышнего витебского

---

32 Тып жылых вежаў, верагодна, прыйшоў у ВКЛ з Польскага Каралеўства, гл.: M. Volkau, *Murowane zamki na tle rozwoju państwa i społeczeństwa w Wielkim Księstwie Litewskim w XIV – pierwszej połowie XVI wieku*, w: *Stan badań nad wielokulturowym dziedzictwem dawnej Rzeczypospolitej*, t. 16, red. W. Walczak, K. Wiszowata-Walcza, Białystok 2023, s. 584–586.

33 Л.В. Колединский, *Верхний замок Витебска (IX–XVIII вв.)...*, с. 21, 465; О.Н. Левко, *Границы Верхнего и Нижнего замков...*, с. 112, 117.

34 О.Н. Левко, *Границы Верхнего и Нижнего замков...*, с. 116–117.

35 *ИЮМ*, т. 21, с. 486; *ИЮМ*, т. 22, Витебск 1891, с. 257, 464.

36 Т.С. Бубенько, *op. cit.*, с. 27–28.

подле вежы Кругликовое еждчали и хожывали"[37]. Паколькі гэтым шляхам, як сведчыць крыніца, у Верхні замак менавіта "еждчали", існавала дарога, ці ўзвоз па схіле гары да брамы, а яе праём мусіў мець дастатковую шырыню, каб праз яго праехаў запрэжаны коньмі воз. Да пачатку 1630-х гг. гэта брама страціла сваё значэнне і перастала функцыянаваць. У вядомых нам апісаннях замкавых умацаванняў 1630–1660-х гг. пра яе ўжо не згадваецца. Час з'яўлення і першапачатковыя функцыі гэтай брамы застаюцца няяснымі.

Круглік, ці Круглікавая вежа (так яна называецца ў крыніцах XVII ст., у тым ліку, у апісаннях 1638, 1639 і 1655 гг.) стаяла на ўсходнім рагу Замкавай гары, у месцы, дзе да ўмацаванняў Верхняга замка падыходзіла абарончая сцяна Ніжняга замка[38]. Менавіта яе мог асобна згадваць М. Стрыйкоўскі, пішучы "zamek i wieżę ta sama xiężna zmurowała"[39]. Выдзяленне хранiстам гэтага будынка сярод іншых сведчыць аб яго значнасці. Верагодна, гэта была высокая вежа кшталту нямецкіх бергфрыдаў[40], якая не выкарыстоўвалася для пастаяннага пражывання, аднак мела выключнае значэнне для абароны, у тым ліку магла стаць апошнім прытулкам для абаронцаў у выпадку прарыву ворага на тэрыторыю замка. Як вынікае з назвы, вежа мела ў плане круглую форму. Паводле апісання 1655 г., яе перыметр раўняўся 27,5 м (12¾ саж.), адпаведна дыяметр мусіў складаць не менш за 9 м (магчыма, быў большы, паколькі складальнік інвентара мог праводзіць вымярэнні са знешняга боку і не ўлічыць частку сцен вежы з боку замкавага двара). Паводле інвентара 1639 г. у Кругліку захоўваліся 4 вялікія гарматы і 6 меншых на колах, а значыць, яго ўнутраныя памяшканні мусілі быць дастаткова значнымі. У 1655 г. вежа было ўжо моцна разбурана, але і ў зруйнаваным стане яе муры дасягалі вышыні 9,7 м (4½ саж.) і ўзвышалася над сумежнымі сценамі.

Ад Кругліка ў паўночна-заходнім кірунку ўздоўж края пляцоўкі Замкавай гары адыходзіла прасла мураванай сцяны даўжынёй 24–26 м (1655 г. – 11 саж., 1665 г. – 12 саж.) і вышынёй каля 6,5 м (1655 г. – 3 саж.), аднак на ёй ужо не было зубцоў. Да згаданага прасла з захаду прымыкала яшчэ адна мураваная вежа, якая да сярэдзіны XVII ст. дайшла разбуранай і не ўзвышалася над сумежнымі сценамі. На чарцяжы 1664 г. бачна, што яна выступала за перыметр сцен замка. Паводле апісання 1655 г., ўшырыню вежа мела 8,6 м (4 саж.). Верагодна, яе ўзвялі на павароце сцяны.

Ад згаданай вежы ўздоўж Віцьбы па схіле Замкавай гары і грэбні старажытнарускага вала ішоў мур даўжынёй 156 м (1655, 1665 гг. – 72 саж.). Да сярэдзіны XVII ст. ён быў ужо моцна пашкоджаны, аднак асобныя

[37] НГАБ, ф. 1751, воп. 1, спр. 12, арк. 293.
[38] *ИЮМ*, т. 22, с. 250–252, 257.
[39] M. Stryjkowski, *op. cit.*, s. 58.
[40] М. Макараў, *Да пытання пра выкарыстанне тэрміну "данжон" (donjon)...*, с. 57.

яго фрагменты ў гэты час узвышаліся на 6,5 м (1655 г. – 3 саж.). У канцы муру знаходзілася форта для выхаду за вадой да Віцьбы. Паводле апісання 1665 г., яна мела шырыню 1,4 м (2/3 саж.) і, як бачна на чарцяжы 1664 г., завяршалася паўцыркульнай аркай. Рэшткі падмуркаў згаданага прасла былі ўскрыты ў 1978 г. у ходзе раскопак пад кіраўніцтвам М.А. Ткачова насупраць будынка па адрасе вуліца Пушкіна 4[41].

Далей на захад да вугла ўмацаванняў Верхняга замка над месцам ўпадзення Віцьбы ў Дзвіну, паводле апісанняў XVII ст., ішла драўляная сцяна з дзвюма драўлянымі вежамі. Апошнія згадваюцца ў крыніцах XVI–XVII стст. і былі пастаўлены на месцах паваротаў замкавага вала. Ад муру драўлянае прасла даўжынёй 24–26 м (1655 г. – 11 саж., 1665 г. – 12 саж.) вяло да першай драўлянай вежы, шырыня якой ў 1655 г. складала 18,4 м (8½ саж.). Далей ішло прасла даўжынёй 134–140 м (1655 г. – 62 саж., 1665 г. – 64¾ саж.) да другой "нарожнай" вежы, шырыня якой, паводле абмераў 1655 г., складала 21,6 м (10 саж.). Мяркуючы па значнай шырыні, гэтыя вежы ў XVII ст. хутчэй нагадвалі артылерыйскія бастэі.

Пры гэтым у захаваных крыніцах няма згадак аб мурах ці хаця б іх рэштках на гэтым адрэзку замкавай сцяны. Верагодна, іх проста не паспелі ўзвесці пры Альгердзе, і гэтае прасла так і засталося драўляным. Неабходна адзначыць, што пры прарэзках старажытнарускага вала ў 1978 г. ля помніка А.С. Пушкіну (раскопкі М.А. Ткачова) і ў 1988 г. на поўнач ад будынка драматычнага тэатра (даследаванні Л.У. Калядзінскага) мураваных канструкцый XIV ст. выяўлена не было[42], што ўскосна пацвярджае нашы высновы. Падобная сітуацыя назіраецца, напрыклад, і ў Наваградку, дзе ўзвядзенне мураваных сцен замка пачалося ў XIV ст., але завяршылі іх па ўсім перыметры ўмацавання толькі ў пачатку XVI ст[43].

Такім чынам, працягласць лініі ўмацаванняў Верхняга замка ў Віцебску складала каля 836–838 м (1655 г. – 387 саж., 1665 г. – 388 саж.), а яго плошча – каля 4 га[44]. Па яго перыметры стаялі 5 мураваных вежаў: дзве абарончыя квадратныя, высокі круглы бергфрыд, брама і "данжон". Акрамя таго з паўночнага боку, верагодна, ужо на раннім этапе існавання замка былі збудаваны дзве драўляныя вежы. Усе вежы, акрамя "данжона" выступалі за перыметр абарончых сцен, што дазваляла весці ўздоўж іх флангавы агонь. Акрамя таго выразна бачна імкненне ўмацаваць вежамі вуглы замка, якія былі найбольш прыдатныя для прамога штурма. Абарончыя сцены мелі розную

[41] Л.В. Колединский, *Верхний замок Витебска (IX–XVIII вв.)...*, с. 21, 56.

[42] *Ibidem*, с. 21; О.Н. Левко, *Границы Верхнего и Нижнего замков...*, с. 112.

[43] М.А. Ткачоў, *Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII–XVIII стст.*, Мінск 1978, с. 47, 49; Ю.М. Бохан, *op. cit.*, с. 418.

[44] Вылічэнні плошчы Верхняга і Ніжняга замкаў выкананы пры дапамозе геаінфармацыйнай сістэмы QGIS з прывязкай да сучаснай тэрыторыі плана Віцебска 1797–1802 гг., на якім паказаны абрысы замкаў. План гл.: Ю.В. Чантурия, *op. cit.*, с. 89.

вышыню. З боку Ніжняга замка, адкуль з большай верагоднасцю можна было чакаць непрыяцельскі напад, муры былі амаль у паўтары разы вышэйшыя (7–7,6 м), чым з боку Дзвіны (4,9 м). Пры гэтым будаўніцтва мураванага замка не было скончана. Сцены на паўночна-заходнім баку замка пры ўпадзенні Віцьбы ў Дзвіну, якія складалі каля 26% ад агульнай працягласці замкавых сцен, так і засталіся драўлянымі. Верагодна, гэты ўчастак лічыўся найбольш бяспечным.

У XIV – першай палове XVI ст. галоўная вуліца Верхняга замка перасякала яго тэрыторыю з захаду на ўсход і мела назву Прабойная[45]. Па ўсёй верагоднасці, яна, абыходзячы так званае "озерко" (невялікі вадаём), ішла ад галоўнай брамы замка над Дзвіной да брамы (форты) ля вежы Круглік. Толькі пасля таго, як у другой палове XVI – пачатку XVII ст. заходні і ўсходні ўезды ў Верхні замак перасталі функцыянаваць, асноўнай камунікацыйнай воссю комплекса стала вуліца, што ішла з поўдня на поўнач – ад новай драўлянай брамы да мураванай форты над Віцьбай. У дакументах другой паловы XVII ст. гэта вуліца называецца Вялікай, а тая, што перасякалася з ёй і ішла на Замкавую гару (былая Прабойная), – Крыжовай[46].

Названае "озерко" знаходзілася ў цэнтральнай частцы Верхняга замка, і ўтварылася пасля нівеліроўкі нізіны, што некалі аддзяляла Замкавую гару ад Дзвінскага ўзвышша, і ўзвядзення ў XII ст. уздоўж берага Віцьбы дрэваземлянога вала[47]. Яно згадваецца ў дакуменце 1565 г., паводле якога мясцовыя жыхары прасілі манарха накіраваць майстра для прывядзення ў парадак берагоў вадаёма і адвядзення ад яго сцёкавых вод, каб можна было выкарыстоўваць ваду з яго[48]. Аднак, па ўсёй верагоднасці, комплекс запланаваных мерапрыемстваў не быў рэалізаваны, бо ў крыніцах канца XVI ст., гэты вадаём фігуруе як "болотъце"[49]. Пра непрыдатнасць вады з яго згадваецца ў апісанні 1655 г.: "воды изъ него не черпаютъ – погано". Аб тым, што ў Верхнім замку існавала праблема з забеспячэннем вадой, ускосна сведчыць адсутнасць у крыніцах канца XVI – першай паловы XVII ст. згадак пра калодзеж на тэрыторыі замка. Вельмі цікавае паведамленне з апісання 1665 г., паводле якога маскоўскія жаўнеры на тэрыторыі Верхняга замка выкапалі два калодзежы, аднак у адным з іх вады не было зусім, а ў другім яна была дрэннай якасці. Таму асноўнай крыніцай вады для жыхароў і абаронцаў замка заставалася Віцьба, да якой можна было трапіць праз форту ў паўночнай лініі сцен замка. У апісанні 1665 г. наўпрост гаворыцца, што "въ осадное время емлютъ воду въ калитку-фортку изъ Видбы рѣки".

---

[45] Т.С. Бубенько, *op. cit.*, с. 63.

[46] Государственный архив Тверской области, ф. 1409, оп. 1, д. 1521, л. 185 об.

[47] Т.С. Бубенько, *op. cit.*, с. 200–201.

[48] *Документы Московского архива Министерства юстиции*, т. 1, подгот. М. Довнар-Запольский, Москва 1897, с. 195–196.

[49] *ИЮМ*, т. 20, с. 505.

У навуковай літаратуры выказваліся меркаванні аб тым, што яшчэ ў старажытнарускі час на гарадзішчы, вядомым пад назвамі Замкавая гара, ці Ламіха, была ўведзена мураваная царква Святога Міхаіла[50]. Відавочна пасля яе разбурэння ў XIV ст. на тым месцы збудавалі невялікую драўляную царкву ў імя таго ж святога, якая часта згадваецца ў крыніцах XVI–XVII стст.[51], а яе выява бачна на чарцяжы 1664 г. Гэты храм перастаў існаваць пасля аднаго з пажараў пачатку – сярэдзіны XVIII ст.

Ад умацаванняў Верхняга замка ў двух месцах адыходзілі абарончыя сцены Ніжняга замка. Ад Кругліка, які стаяў на пляцоўцы Замкавай гары, ва ўсходнім кірунку па схіле ўзвышша спускалася прасла муру даўжынёй 52 м (1655 г. – 24 саж., 1665 г. – 24¼ саж.). Далей, паводле крыніц XVI – першай паловы XVII ст., у лініі ўмацаванняў Ніжняга замка знаходзілася Завіцебная (Віцебная, Віцебская) брама, перад якой размяшчаўся мост праз раку Віцьбу, які таксама называўся Завіцебным. Адна з самых ранніх згадак пра Завіцебную браму адносіцца да 1538–1539 гг[52]. Пры гэтым застаецца незразумелым, ці існавала ў гэтым месцы мураваная вежа-брама ў XIV–XV стст.

Ад Завіцебнай брамы, уздоўж Віцьбы і ручая, ва ўсходнім кірунку ішло прасла муру, якое ўпіралася ў паўночна-ўсходнюю "нарожную" вежу Ніжняга замка. Паміж 1655 і 1665 гг. умацаванні Ніжняга замка былі істотна перабудаваны, у тым ліку пераносіліся і будаваліся новыя вежы, што ўскладняе супастаўленне двух маскоўскіх апісанняў. Так, з-за пераносу "нарожнай" вежы на паўночна-ўсходнім вуглу Ніжняга замка і іншых трансфармацый даўжыня згаданай сцяны змянілася з 184 м (85 саж.) у 1655 г. да 203 м (94 саж.) у 1665 г.[53] Таму для рэканструкцыі першапачатковага Ніжняга замка на сярэдзіну XVII ст. далей мы будзем абапірацца толькі на апісанне 1655 г.

---

[50] Л.У. Калядзінскі, *Віцебскі храм Св. Міхаіла*, "Весці Акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук" 1995, № 1, с. 59–65.

[51] *Судебная книга витебского воеводы, господарского маршалка, волковыского и оболецкого державцы М.В. Клочко...*, с. 324; M. Stryjkowski, *op. cit.*, s. 58.

[52] *Беларускі архіў*, т. 2: *Літоўская метрыка (XV–XVI ст.)*, выд. З. Даўгяла, Мінск 1928, с. 282–283.

[53] У 2017 г. на гэтым участку пры правядзенні археалагічныхназіранняў падчас рэканструкцыі фантана ў парку па пр. Фрунзе В.М. Ляўко выявіла рэшткі сцяны з невялікіх камянёў на вапнавай рошчыне, арыентаванай па лініі паўночны захад – паўднёвы ўсход (прыблізна на "Духаўскі круглік"), і палічыла яе рэшткамі ўсходняга прасла ўмацаванняў Ніжняга замка (О.Н. Левко, *Границы Верхнего и Нижнего замков...*, с. 117, 121–123). Аднак, у сапраўднасці выяўленая сцяна наўрад ці мае нешта агульнае з фартыфікацыяй эпохі Сярэднявечча. Згодна з вымярэннямі 1655 і 1665 гг. даўжыня паўночнага прасла сцяны Ніжняга замка ад Завіцебнай брамы да "нарожнай" вежы складала 184–203 м, а В.М. Ляўко пакідае на яго не больш за 140 м. Акрамя таго, усходняе прасла мураванай сцяны Ніжняга замка XIV ст. прасочана археалагічна, яно праходзіла значна далей на ўсход і прымыкала да паўднёва-ўсходняй "нарожнай" вежы з паўночнага, а не паўночна-заходняга боку (Т.С. Бубенько, *op. cit.*, с. 32, 202, 225).

Усходні адрэзак умацаванняў першапачаткова быў найменей абароненай натуральнымі перашкодамі і, адпаведна, найбольш прыдатнай на атакі непрыяцеля часткай Ніжняга замка. Сваімі паўночным і паўднёвым флангамі гэты адрэзак абапіраўся на глыбокія яры з ручаямі. У XIV–XV стст. паміж імі яшчэ не было глыбокага рова, які злучыў ручаі і фактычнаператвараў Віцебскія замкі ў аточаны з усіх бакоў вадой востраў[54]. Менавіта таму, кароткая ўсходняя сцяна стала самым моцным і насычаным фартыфікацыйнымі элементамі часткай умацаванняў Ніжняга замка. У XIV ст. тут, на адрэзку даўжынёй не больш за 100 м, было ўзведзена ажно 3 мураваныя вежы (паўночна-ўсходняя і паўднёва-ўсходняя "нарожныя", а таксама вежа-брама паміж імі), злучаныя паміж сабой мурамі. Глыбокі роў з'явіўся толькі пасля каралеўскіх распараджэнняў снежня 1551 г[55]. Як сведчыць інвентар 1638 г., у першыя дзесяцігоддзі XVII ст. каменна-цагляныя канструкцыі паўночна-ўсходняй вежы яшчэ захоўваліся на значную вышыню. У 1655 г. іх ужо не было, а на іх месцы ўзвялі драўляную Гуркову вежу шырынёй 6,5 м (3 саж.). Паводле інвентара 1638 г. вежа-брама, што ў XVII ст. называлася Задунаўскай (Задунайскай), таксама ўжо была драўлянай, а ад паўднёва-ўсходняй "нарожнай" вежы захоўваліся толькі ніжнія часткі муроў, на якіх паставілі драўляны будынак. У апісанні 1655 г. яна названа Засельнай, або Сельнай. Даўжыня ўмацаванняў паміж дзвюма ўсходнімі "нарожнымі" вежамі складала 86 м (40 саж.).

У ходзе археалагічных даследаванняў усходняй лініі ўмацаванняў Ніжняга замка, што праводзіліся ў 1980–1990-х гг. пад кіраўніцтвам Т.С. Бубенькі, былі выяўлены і вывучаны рэшткі наступных мураваных канструкцый XIV ст.: брамы, паўднёва-ўсходняй "нарожнай" вежы і прасла сцяны паміж імі[56]. На жаль, асноўная частка падмуркаў брамы знаходзіцца пад праезжай часткай праспекта Фрунзе, таму правесці яе даследаванні і вызначыць габарыты будынка не ўдалося. Падмурак паўднёва-ўсходняй вежы мае чатырохвугольную форму памерамі 6,9 х 8,2 х 7 х 8 м і прыстаўлены звонку да паўднёвай сцяны замка, якую, такім чынам, можна было прастрэльваць уздоўж агнём з вежы. Заўважым, што за лінію ўсходняй сцяны будынак не выступаў. Паводле М.А. Ткачова і Т.С. Бубенькі, паўднёва-ўсходняя вежа магла дасягаць вышыні 12–13 м і мець не больш за 3 баявыя ярусы[57]. Можна дапусціць, што паўночна-ўсходняя "нарожная" вежа мела падобныя габарыты і такім жа чынам прылягала да паўночнай сцяны замка. У такім выпадку, фланкіраванне самой усходняй сцяны ў XIV–XV стст. магло ажыццяўляцца з высунутай за яе лінію вежы-брамы.

---

54 Т.С. Бубенько, *op. cit.*, с. 31, 201.

55 AGAD, AR, dz. X, sygn. 598, s. 1.

56 Т.С. Бубенько, *op. cit.*, с. 32–33, 223, 225.

57 М.А. Ткачоў, Т.С. Бубенька, *Да пытання аб каменных умацаваннях Дольняга замка Віцебска*, в: *Гістарычна-археалагічны зборнік. Памяці М. Ткачова*, ч. 2, Мінск 1993, с. 157.

Ад паўднёва-ўсходняй "нарожнай" вежы над стромымі схіламі яра, па якім працякаў Замкавы ручай, у заходнім кірунку цягнуўся адрэзак замкавай сцяны, даўжыня якога складала 503 м (1655 г. – 233 саж.). Паводле інвентара 1638 г., толькі кароткі яго ўчастак ля самой вежы – 19 м (26 крокаў)[58] – быў мураваным. Яго выявілі ў ходзе раскопак 1984 г.[59] Пра рэшткі муроў на асноўнай частцы гэтага адрэзка ў апісаннях замка XVII ст. і іншых крыніцах не згадваецца. Верагодна, іх тут не было ад самага пачатку існавання Ніжняга замка, а гэты ўчастак быў абаронены выключна валам і драўлянымі сценамі.

Паўднёва-заходняя частка Ніжняга замка была абнесена мурамі, згадкі аб якіх маюцца ў інвентарах 1638 і 1639 гг. Таксама фрагмент мура ля Заручаўскай брамы бачны на чарцяжы 1664 г. Апісаны вышэй адрэзак драўляных сцен упіраўся ў мураваную вежу, якая ў інвентары 1638 г. названа "нарожнай". Верагодна, менавіта на яе мурах да 1655 г. была збудавана Узводная вежа шырынёй 6,5 м (3 саж.). Адпаведна, гэтая мураваная вежа была блізкай па габарытах да "нарожных" вежаў ва ўсходняй частцы замка і, напэўна, выступала за перыметр сцен з мэтай іх фланкіравання. Ад яе па палогім паўднёвым схіле Дзвінскага ўзвышша ў заходнім кірунку ішоў мур даўжынёй 123 м (1655 г. – 57 саж.). Ён прымыкаў да Заручаўскай брамы, крайняга паўднёва-заходняга абарончага элемента Ніжняга замка. Адна з найбольш ранніх згадак пра Заручаўскую браму ў захаваных дакументах датуецца 1593 г.[60] Як занатавана ў інвентары 1638 г., гэта брама згарэла ў час пажару 1614 г., а на яе месцы быў узведзены новы драўляны будынак, шырыня якога, паводле апісання 1655 г., складала 13 м (6 саж.). Улічваючы важнасць разгледжанага ўчастка ў сістэме абароны умацавання, можна з высокай доляй верагоднасці дапусціць, што у XIV ст. на месцы пазнейшай драўлянай брамы існавала мураваная вежа-брама, якая ў тым ліку ўмацоўвала паўнёва-заходні вугал Ніжняга замка.

У пачатку 1990-х гг. у ходзе археалагічных раскопак пад кіраўніцтвам Т.С. Бубенькі быў ускрыты і вывучаны фрагмент падмуркаў паўднёвай сцяны Ніжняга замка ля колішняй Заручаўскай брамы. Паколькі мур на гэтым адрэзку праходзіў па палогім схіле, яго таўшчыня была даведзена да рэкордных 3,2 м (таўшчыня сцяны ва ўсходняй частцы замка не перавышала 1,6 м). Цікава таксама, што выяўленыя тут мураваныя канструкцыі нясуць на сабе яўныя сляды пазнейшых рамонтаў[61].

---

[58] 1 рымскі крок – 0,74 м, гл.: K. Łopatecki, *Okoliczności powstania i przydatność wojskowa mapy Descriptio Ducatus Polocensis Stanisława Pachołowieckiego (1580)*, „Terminus" 19, 2017, z. 1(42), s. 105.

[59] Т.С. Бубенько, *op. cit.*, с. 202.

[60] *ИЮМ*, т. 20, с. 503.

[61] Т.С. Бубенько, *op. cit.*, с. 33, 225.

Ад паўднёва-заходняга вугла мур паварочваў на поўнач, ішоў ўздоўж стромага берага Дзвіны і на адлегласці ў 141–147 м (1638 г. – 190 крокаў, 1655 г. – 68 саж.) ад Заручаўскай упіраўся ў Жыдоўскую браму. Па ўсёй верагоднасці, у XIV – першай палове XVI ст. прыкладна з гэтага месца пачынаўся так званы Высокі мост, які падводзіў да галоўнай на той час "наддзвінскай" брамы Верхняга замка. Можна дапусціць, што ў XIV ст. брама, вядомая пазней пад назвай Жыдоўская, мела форму простага праёма ў сцяне. Ад яе да муравanай паўднёва-заходняй "нарожнай" вежы Верхняга замка ўздымалася на вал прасла муру даўжынёй 30–35 м (1638 г. – 40 крокаў., 1655 г. – 16 саж.).

Агульная працягласць умацаванняў Ніжняга замка складала 1171–1181 м (1655 г. – 542 саж., 1665 г. – 546 ¾ саж.), а яго плошча дасягала 7 га. На падставе інфармацыі з інвентара 1638 г. можна сцвярджаць, што мураваныя абарончыя сцены закрывалі толькі 59% перыметра Ніжняга замка. Такім чынам, іх будаўніцтва пры Альгердзе так і не было завершана.

Тое, што мураваныя ўмацаванні Ніжняга замка, фактычна ўзведзеныя ў XIV ст., выразна падзяляліся на два адасобленыя і аддаленыя адзін ад аднаго амаль на 500 м адрэзкі, дазваляе нам прапанаваць уласную трактоўку паведамлення "Видбеск. 3 стены камены" з тэкста "Списка русских городов дальних и ближних"[62]. Першая мураваная сцяна акружала Верхні замак, другая і трэцяя – Ніжні замак з паўночна-ўсходняга і паўднёва-заходняга бакоў. З крыніц вынікае, што ў перыметры ўмацаванняў Ніжняга замка было ўзведзена чатыры мураваныя вежы: Задунаўская брама і тры "нарожныя" вежы. Верагодна мураванай была і Заручаўская брама, улічваючы яе важнае значэнне і лакалізацыю на вуглу замкавых сцен.

Паводле інвентара 1639 г., па ўсім перыметры Ніжняга замка існаваў земляны вал, які ў большасці месцаў на той час быў невысокім, бо характарызуецца як "апаўшы". Найбольшыя памеры ён меў у раёне Задунаўскай брамы, якая,

---

[62] М.Н. Тихомиров, *Список русских городов дальних и ближних*, "Исторические записки" 40, 1952, с. 224. У навуковай літаратуры маецца некалькі тлумачэнняў гэтага паведамлення. М.А. Ткачоў лічыў "3 стены камены" вынікам аптычнай ілюзіі, бо, на яго думку, тагачасны чалавек, які набліжаўся да Віцебска з захаду ці ўсходу, з-за асаблівасцей рэльефу сапраўды мог бачыць 3 рады мураваных сцен (М.А. Ткачев, *Замки Белоруссии...*, с. 121). На думку Л.У. Калядзінскага, першай мураванай сцяной з'яўляліся ўмацаванні Ніжняга замка, другой – умацаванні Верхняга замка, а трэцяй – сцяна, што нібыта ішла па краі пляцоўкі Замкавай гары і з'яўлялася апошнім рубяжом абароны (Л.В. Колединский, *Верхний замок Витебска (IX–XVIII вв.)...*, с. 56). На наш погляд, канцэпцыя Л.У. Калядзінскага пры ўсёй яе ўяўнай лагічнасці не выходзіць за рамкі гіпотэзы. У апісаннях XVII ст., калі мураваныя умацаванні яшчэ захоўваліся ў адносна добрым стане, ніякіх дадатковых абарончых сцен на Замкавай гары не згадваецца. Мураваная сцяна, выяўленая А.П. Сапуновым пры раскопках у заходняй частцы Замкавай гары, якую згадвае Л.У. Калядзінскі, не задакументавана належным чынам. Гэта пакідае шырокае поле для дапушчэнняў наконт яе размяшчэння, арыентацыі і функцый.

ў інвентары 1639 г., названа “вышняй”, бо стаяла “высока”. Вал у гэтым месцы згадваецца і ў інвентары 1638 г., а ў крыніцы, што датуецца 1720 г., сустракаецца назва “Дунайскі вал”[63]. У адрозненне ад валу Верхняга замка, гэты вал паўстаў ужо пасля ўзвядзення мураваных умацаванняў, аб чым сведчаць вынікі археалагічных даследаванняў. Пры гэтым, ён некалькі разоў падсыпаўся для ўмацавання мураваных і драўляных сцен Ніжняга замка. Т.С. Бубенька выдзяляе як мінімум тры падсыпкі вала, выкананыя ў XIV–XV стст[64]. Разам з тым, з пісьмовых крыніц вынікае, што вал маглі падсыпаць і ў XVII ст. Так, у інвентары 1639 г. згадваецца “насыпаны” вал ля Жыдоўскай брамы.

Галоўнай камунікацыйнай воссю Ніжняга замка была вуліца Вялікая, што ішла ад Заручаўскай брамы спачатку амаль на поўнач, а пасля праходу праз рынак – на паўночны-ўсход у раён сучаснай плошчы Свабоды. Тут яна падзялялася на два адгалінаванні, адно з якіх вяло на поўнач да Завіцебнай брамы, а другое – на ўсход да Задунаўскай брамы. У крыніцах XVI–XVII стст. адгалінаванні гэтай вуліцы, якія выводзілі да трох галоўных брам Ніжняга замка, выступаюць пад назвай “Вялікая”, што сведчыць пра іх значнасць. Цэнтрам заходняй часткі Ніжняга замка з’яўлялася старажытная рынкавая плошча, якая размяшчалася на поўнач ад Дабравешчанскай царквы[65]. У XIV – першай палове XVI ст. у паўночна-заходняй частцы гэтай плошчы мусіў быць праезд, што праз браму (пазнейшую Жыдоўскую) выводзіў на мост да галоўнай “наддзвінскай” брамы Верхняга замка. Другі рынак існаваў ва ўсходняй частцы Ніжняга замка ля скрыжавання адгалінаванняў вуліцы Вялікай. Гандаль мог весціся і проста на вуліцах: так, пад 1594 г. згадваецца крамная камора на вуліцы Вялікай ля Завіцебнай брамы. Па сведчанні крыніц XVI ст., ва ўсходняй частцы Ніжняга замка меліся таксама завулак Казмадзям’янскі (у сектары паміж паўночным і ўсходнім адгалінаваннямі вуліцы Вялікай) і вуліца Прабойная[66]. Апошняя ішла на Замкавую гару і, як можна меркаваць, выходзіла да ўсходняй брамы Верхняга замка ля вежы Круглік.

Ля рынкавай плошчы ў заходняй частцы Ніжняга замка стаяла мураваная Дабравешчанская царква, узведзеная яшчэ ў XII ст. Тут жа, пры рынку, не пазней за другую палову XV ст быў пастаўлены драўляны касцёл Святой Троіцы[67]. Ва ўсходняй частцы Ніжняга замка ў XIV–XVI стст. магло размяшчацца яшчэ, па меншай меры, чатыры праваслаўныя храмы. Непасрэдна на рынку ўсходняй часткі Ніжняга замка стаяла Пятніцкая царква[68], якая апошні

[63] *ИЮМ*, т. 26, с. 418.

[64] Т.С. Бубенько, *op. cit.*, с. 32, 35.

[65] *Ibidem*, с. 60–61, 201.

[66] *Ibidem*, с. 61–62, 201; *ИЮМ*, т. 20, с. 420–421, 499.

[67] Пад канец панавання Казіміра Ягелончыка ён ужо існаваў, гл.: *Lietuvos metrika. Knyga 5: (1427–1506). Užrašytų knyga 5*, wyd. E. Banionis, Vilnius 1993, s. 260–261.

[68] Т.С. Бубенько, *op. cit.*, с. 62; *ИЮМ*, т. 20, с. 505, 509.

раз згадваецца ў інвентары 1638 г. У наступным годзе яе пляц перадалі езуітам, а будынак разабралі. Іншыя храмы зніклі да канца XVI ст., аднак пра іх існаванне сведчыць тапанімія, зафіксаваная ў крыніцах. Так, у 1592 г. згадваецца Казмадзям'янскі завулак[69], у дакуменце 1594 г. – "царковішча Святога Івана"[70], а ў актах 1564 і 1626 гг. – Юр'еўскі мост пад усходнім схілам Замкавай гары[71]. Адпаведна, у раней на тэрыторыі Ніжняга замка стаялі яшчэ тры царквы: Святых Казьмы і Дзям'яна, Святога Іаана і Святога Юрыя.

## Трансфармацыя замкаў у канцы XIV – першай палове XVII ст.

На далейшы лёс Віцебскіх замкаў і іх архітэктуру уплывалі два асноўныя фактары. Першы – войны, якія стымулявалі будаўнічыя працы або прыводзілі да разбурэнняў умацаванняў, другі – спецыфіка сістэмы забеспячэння і будаўніцтва ўмацаванняў. На іх мы і засяродзім увагу ніжэй.

Значныя наступствы для Віцебскіх замкаў мела іх аблога войскам Вітаўта з выкарыстаннем артылерыі ў 1393 г., калі ва ўмацаванні абараняўся Свідрыгайла. Паводле М. Стрыйкоўскага, Ніжні замак здабывалі чатыры тыдні. Менавіта, тады маглі быць значна пашкоджаны яго мураваныя брамы, якія ў далейшым разабралі. Верхні замак, як пісаў храніст, абстрэльвалі "we dnie i w nocy bez przestanku", прычым ён дакладна зафіксаваў, што была пашкоджана адна з вежаў Верхняга замка з боку Дзвіны[72]. Мяркуючы па накірунку, адкуль вёўся абстрэл, тады ж быў зроблены вялікі пралом у паўднёвай сцяне і пашкоджаны вежападобны палац. У час унутрыдзяржаўных канфліктаў у 1432–1436 і 1440 гг. Віцебск меў важнае значэнне як ваенная база, а ў 1435 г. нават знаходзіўся ў аблозе, але згадкі пра спробы штурмаваць яго замкі ў гэтыя гады адсутнічаюць[73].

Ужо ў XV ст. паўсталі праблемы з аднаўленнем мураваных будынкаў і ўмацаванняў, якія былі пашкоджаны ў час войнаў або заняпалі з-за адсутнасці належнага догляду. Калі замкі будаваліся, Віцебск з'яўляўся важнейшым вотчынным уладаннем і рэзідэнцыяй Альгерда, а пасля – яго сына Ягайлы. Пры Вітаўце, калі ўлада ў ВКЛ была цэнтралізавана, у Віцебск сталі прызначаць намеснікаў вялікага князя, што змяніла ўмовы функцыянавання замкаў. Вядома, што ў 1470 г. віцебскі намеснік Мікалай

---

69 *ИЮМ*, т. 20, с. 499.

70 *ИЮМ*, т. 20, с. 389.

71 *ИЮМ*, т. 21, с. 469; *НГАБ*, ф. 1751, воп. 1, спр. 12, арк. 293.

72 M. Stryjkowski, *op. cit.*, s. 109.

73 Падрабязней гл.: С.В. Полехов, *Наследники Витовта. Династическая война в Великом княжестве Литовском в 30-е годы XV века*, Москва 2015, с. 321, 391, 406, 410–411, 416.

Няміравіч ад імя вялікага князя звяртаўся да рыжан з просьбай прыслаць муляра для направы скляпенняў у нейкай мураванай пабудове[74]. Гэта выразна сведчыць пра адсутнасць у горадзе ў азначаны час кваліфікаваных рамеснікаў гэтай спецыяльнасці. У крыніцах XVI – першай паловы XVII ст. таксама не ўдалося выявіць звесткі пра муляроў у Віцебску. А самай ранняй згадкай пра муранае будаўніцтва ў горадзе пасля ўзвядзення замкаў трэба лічыць запіс пра кантракт на пабудову трох мураваных дамоў, заключаны ў 1647 г. паміж бурмістрам Сцяпанам Пятровічам і неназванымі дойлідамі[75]. Можна ўпэўнена казаць, што ў XV – першай палове XVII ст. у Віцебску адсутнічала сістэма догляду за мураванымі пабудовамі замкаў, што адмоўна ўплывала на іх стан.

У 1501 г., адначасова з вялікім паходам на Смаленск, маскоўскія войскі ўпершыню спустошылі пасады Віцебска[76]. Пазней Віцебскія замкі на два стагоддзі сталі важнейшым умацаваннем ВКЛ на мяжы з Маскоўскай дзяржававй. Да горада маскоўскія войскі падыходзілі зімой 1514/1515 гг., летам 1516 г., у 1519 г. і зімой 1519/1520 гг., а таксама ў 1536 г., аднак ад іх цярпелі пераважна пасады, а замкі не былі здабытыя[77]. З першай паловы XVI ст. маюцца згадкі пра будаўніцтва замкавых умацаванняў з дрэва. Так, у 1538–1539 гг. быў заключаны кантракт паміж віцебскім ваяводам Мацеем Война́ехавічам Клочкам і мясцовымі дойлідамі на ўзвядзенне вежы ля Завіцебнай брамы за гаспадарскія грошы. Гэта мусіла быць шасціграннае збудаванне з чатырма "памостамі" (пяццю ярусамі), пакрытае цёсам. Пры гэтым першыя два паверхі дойліды мусілі зрубіць "у дзве сцяны"[78], што значна ўзмацняла вежу. Пад 1544 і 1546 гг. маюцца згадкі пра прыцягненне віцебскім гараднічым Раманам Гарасімовічам падданых "ку городу городен робити"[79].

Небяспека маскоўскага нападу на Віцебск востра адчувалася ў 1551 г., што стымулявала клопат аб павышэнні абараназдольнасці мясцовых замкаў. У гэтым кантэксце трэба разглядаць прывілей Жыгімонта ІІ Аўгуста ад

[74] *Віцебска-Рыжскія акты XIII–XVII ст.: дагаворы і службовая карэспандэнцыя паміж органамі кіравання горада Віцебска і ганзейскага горада Рыгі (з былога комплекса Ruthenica Дзяржаўнага Гістарычнага Архіва Латвіі)*, т. 1, падрыхт. А. Дзярновіч, Мінск 2005, с. 25, 57–58.

[75] М.Д. Макараў, *Рынкавая плошча Віцебска ў другой палове XVI – пачатку XVIII ст.*, "Архіварыус" 20, 2022, с. 157.

[76] М.М. Кром, *Меж Русью и Литвой. Пограничные земли в системе русско-литовских отношений конца XV – первой трети XVI в.*, Москва 2010, с. 208.

[77] А. Сапунов, В. Друцкий-Любецкий, *Материалы по истории и географии Дисненского и Вилейского уездов Виленской губернии*, Витебск 1896, с. 69; М.М. Кром, *op. cit.*, с. 88, 223; В.А. Варонін, *Падзеі вайны 1512–1522 гадоў у Беларускім Падзвінні*, "Studia Historica Europae Orientalis" 6, 2013, с. 194–195, 199–201; А.Н. Лобин, *Оборона Опочки 1517: Бесова деревня против армии Константина Острожского*, Москва 2017, с. 14, 51–52.

[78] *Беларускі архіў...*, т. 2, с. 282–283.

[79] *Archiwum książąt Lubartowiczów Sanguszków w Sławucie*, t. 4: *1535–1547*, Lwów 1890, s. 395, 466.

23 лістапада 1551 г. на пабудову гасціннага двара на Узгорскім пасадзе. Згодна з дакументам, ад іншаземцаў, якія прыязджалі ў Віцебск, магла ўзнікнуць “большая здрада и шкода оному месту [...] пограничному”[80]. Перанос гандлёвага і грамадскага цэнтра мяшчанскай абшчыны на пасад азначаў большую мілітарызацыю замкаў. 29 снежня 1551 г. манарх выдаў прывілей Альбрыхту Вільчку на пабудову і ўтрыманне млыноў на Віцьбе і Ручаі з дазволам злучыць іх “перакопам”, ці рвом. Пры гэтым у дакуменце ўказвалася, што адной з галоўных мэт гэтай акцыі было абвесці замкі вадой для ўмацавання іх абароназдольнасці (“tedy lepszo bespecznosc czyniło zamku czasu gwałtu od nieprzeiaciela”). Пра вялікае значэнне гэтай акцыі для ўсяго горада сведчыць ускладванне абавязка па выкананні земляных прац на мясцовых мяшчан[81]. Пэўныя земляныя працы, верагодна, былі праведзены і на поўдзень ад Ніжняга замка, паколькі М. Стрыйкоўскі ахарактарызаваў Замкавы ручай як “przykop zamkowy”[82].

У 1558 г. пачалася Інфлянцкая вайна, а ў наступным годзе на сойме прадстаўнікі Віцебскага павету звярнуліся з просьбай да Жыгімонта ІІ Аўгуста “въ Нижнемъ и Верхнемъ замку вежи оправити”[83]. Зварот да манарха сведчыць пра няздольнасць вырашыць гэтыя праблемы сваімі сіламі. У 1562 г. падчас нападу на Віцебск маскоўскіх войскаў былі цалкам спалены пасады. Пры гэтым хадзілі чуткі, што рыхтуецца наступны паход “з гарматамі”, каб урэшце здабыць фартэцыю[84]. Аднак удар быў нанесены па Полацку, які капітуляваў 15 лютага 1563 г., пасля чаго Віцебск набыў першаступенную важнасць для абароны ВКЛ у Падзвінні. Праблему фартэцыі абмяркоўвалі на сойме 1565/1566 гг., прычым адзначалася, што “замок Вышний вельми опал”, а Станіслаў Пац (з 1563 г. “спраўца Віцебскага ваяводства”) умацоўваў яго “плотом и глиною” за сродкі з гаспадарскага скарбу. Абываталі Віцебскага ваяводства напраўлялі “другую часть замку” (па ўсёй верагоднасці, Ніжні замак), але там працы не былі скончаны, і гаспадар абяцаў прысласць у дапамогу людзей з воласці[85].

У 1568 г. пагроза нападу на Віцебск маскоўскіх войскаў ізноў узрасла. Пры гэтым Жыгімонт ІІ Аўгуст усведамляў дрэнны стан яго замкаў і летам 1568 г. дасылаў грошы на іх рамонт[86]. Значнае маскоўскае войска падышло да Віцебска 29 верасня 1568 г., але, прастаяўшы некалькі дзён і спаліўшы

---

80 *Метрыка Вялікага Княства Літоўскага: кніга № 35 (1551–1558): кніга запісаў № 35 (копія канца XVI ст.)*, падрыхт. А.А. Мяцельскі, Мінск 2020, с. 113–114.

81 AGAD, AR, dz. X, sygn. 598, s. 1.

82 M. Stryjkowski, *op. cit.*, s. 14.

83 *Витебская старина...*, т. 1, с. 54.

84 J. Jasnowski, *Materjały do działalności wojskowej Floriana Zebrzydowskiego*, „Przegląd Historyczno-Wojskowy” 9, 1937, z. 2, s. 281–285.

85 *Документы Московского архива Министерства юстиции...*, т. 1, с. 193.

86 *Archiwum książąt Lubartowiczów Sanguszków w Sławucie*, t. 7: *1554–1572*, Lwów 1910, s. 278, 306.

пасады, адступіла[87]. З дакумента 1576 г. вядома, што ў гады Інфлянцкай вайны віцебская шляхта дабраахвотна (не ў рамках павіннасці) сваімі сіламі ўзвяла на заходнім адрэзку ўмацаванняў Верхняга замка з боку Дзвіны Усценскую і Прачысценскую вежы[88]. М. Стрыйкоўскі таксама пісаў, што адна з напаўразбураных мураваных вежаў заходняй часткі Верхняга замка была ў гэты час "забудавана дрэвам"[89]. Верагодна, менавіта ў часы Інфлянцкай вайны была закінута старая мураваная брама з боку Дзвіны, а пасярэдзіне паўднёвай сцяны Верхняга замка пабудавалі новую драўляную вежу-браму з драўляным мостам перад ёй. Такім чынам, матэрыялы XVI ст. не даюць падстаў казаць пра спробы аднаўлення мураваных збудаванняў. Пры гэтым найбольш хуткімі тэмпамі разбураліся мураваныя сцены Ніжняга замка, якія замяняліся на драўляныя. Гэтым тлумачыцца той факт, што Аляксандр Гваньіні і Мацей Стрыйкоўскі, якія ў гады Інфлянцкай вайны служылі ў Віцебску, выразна выдзялялі мураваны Верхні і драўляны Ніжні замак[90].

У 1602 г. запарожскія казакі, якім не заплацілі за службу ўлады Рэчы Паспалітай, захапілі і разрабавалі Віцебск. Мяшчане зачыніліся ў замках, якія казакі штурмаваць не сталі[91]. 17 мая 1614 г. Верхні і Ніжні замкі разам з усёй іх пераважна драўлянай забудовай былі знішчаны моцным пажарам[92]. Сляды гэтай катастрофы былі добра бачны нават праз два дзесяцігоддзі, бо ў інвентары 1638 г. усе рэшткі мураваных умацаванняў Верхняга і Ніжняга замкаў апісаны як "абгарэлыя". Нягледзячы на маштабныя знішчэнні ў выніку пажару, у 1616 г. маскоўскае войска, якое захапіла і спаліла віцебскія пасады, не адважылася на штурм замкаў[93]. Варта адзначыць, што ў перыяд з пачатку XVI ст. да сярэдзіны XVII ст. у нас няма звестак пра спробы здабываць Віцебскія замкі з выкарыстаннем цяжкой артылерыі, без якой імі фактычна немагчыма было авалодаць.

Неўзабаве пасля пажару 1614 г. пачалася адбудова умацаванняў замкаў. Як сведчыць інвентар 1638 г., працы вяліся пры віцебскім ваяводзе Яне Завішу, які займаў гэтую пасаду да 1626 г., але не былі скончаны і пазней не працягваліся. Гэта выразна бачна па згаданым апісанні. Па стане на 1638 г. у Верхнім замку была цалкам адбудавана драўляная брама і мост перад ёй. Толькі на паўднёва-ўсходнім прасле мураванай сцяны былі драўляныя

[87] *Витебская старина...*, т. 4, ч. 1, с. 161, 237.

[88] НГАБ, ф. КМФ-18, воп. 1, спр. 60, арк. 22 адв. 23.

[89] M. Stryjkowski, *op. cit.*, s. 109.

[90] Т.С. Бубенько, *op. cit.*, с. 31.

[91] Т.Р. Ковалец, *Узброены канфлікт запарожцаў і віцяблян ў пачатку XVII ст.*, "Ученые записки УО «ВГУ им. П.М. Машерова». Сборник научных трудов" 22, 2016, с. 61–69.

[92] Riksarkivet, Extranea IX Polen, vol. 105. Ліст Якуба Задзіка да Ваўжынца Гэмбіцкага, Варшава 2 VI 1614. Дзякуем Пшэмыславу Гаўрону за ўказанне на гэтую крыніцу.

[93] *Витебская старина...*, т. 1, с. 95.

"абламкі", але і тыя не мелі памосту і даху, а некаторыя ўжо паспелі пагніць. На Кругліку стаяла незавершаная драўляная вежа, якая пачала ападаць. Дрэвам сталі закрываць зруйнаваныя месцы ў паўночна-ўсходнім прасле сцяны але і гэта праца не была скончана. Не былі таксама завершаны "ізбіцы" ў паўночна-заходняй частцы ўмацавання. Іх наяўнасць сведчыць пра тое, што абарончы перыметр Верхняга замка ў месцах, дзе не было мураваных сцен ці яны былі разбураны, імкнуліся закрываць з дапамогай гародняў. Над месцам упадзення Віцьбы ў Дзвіну была ўзведзена двухпавярховая драўляная Усценская вежа.

Пажар 1614 г., відаць, не абмінуў і драўляную царкву Святога Міхаіла, аднак да 1638 г. яна была адбудавана. Як сведчаць інвентары 1638 і 1639 гг., у Верхнім замку у двух драўляных цэйхгаўзах, Кругліку і Усценскай вежы захоўваліся зброя і боепрыпасы. Акрамя таго на яго тэрыторыі знаходзіліся ваяводскія стайні. З XVI ст. вежу Круглік пачалі выкарыстоўваць як турму. Найбольш ранняя згадка пра ўтрыманне вязняў у адной з вежаў замка паходзіць з 1544 г.[94] У 1593–1594 гг. згадваецца "старая мураваная турма", што знаходзілася "на гары"[95], відавочна, мелася на ўвазе Замкавая гара. У дакуменце 1628 г. прама сказана, што злачынцаў садзілі ў Круглік[96]. Але неўзабаве, як сведчыць інвентар 1638 г., турма была перанесена ў драўляную вежу-браму. Гэта было зручна, паколькі ў браме заўсёды прысутнічала варта, якая адначасова пільнавала вязняў.

Умацаванні Ніжняга замка былі ў значна горшым стане. Як вынікае з урыўкавых звестак канца XVI ст., пасля Інфлянцкай вайны іх яшчэ імкнуліся падтрымліваць у адносным парадку. Так, пад 1594 г. згадваецца пра "абламкі" ля Завіцебнай брамы, якімі завяршалася замкавая сцяна[97]. Такім чынам, мураваныя канструкцыі ўмацаванняў Ніжняга замка ў асобных месцах яшчэ былі ў неблагім стане. Але пасля пажару 1614 г. іх канчаткова закінулі. У 1616 г. Ніжні замак называецца "астрожкам", а гэта азначае, што па перыметры ён быў умацаваны пераважна драўляным вастраколам, ці астрогам[98]. Паводле інвентара 1638 г., усе чатыры брамы – Заручаўская, Завіцебная, Задунаўская і Жыдоўская – былі адбудаваны пры Яну Завішу, а значыць да 1626 г. Пры гэтым Завіцебная брама не была скончана. Паводле пазнейшых маскоўскіх апісанняў яна мела шырыню 8,6–9,7 м (1655 г. – 4 саж., 1665 г. – 4 ½ саж.). Жыдоўская брама, паводле апісання 1655 г., мела шырыню 6,5 м (3 саж). Да 1638 г. пачалі ставіць драўляныя надбудовы на трох зруйнаваных мураваных

---

[94] *Archiwum książąt Lubartowiczów Sanguszków w Sławucie*, t. 4, s. 395.

[95] *ИЮМ*, т. 1, с. 338; *ИЮМ*, т. 20, с. 504.

[96] *ИЮМ*, т. 22, с. 250–252.

[97] *ИЮМ*, т. 20, с. 420–421.

[98] *Витебская старина...*, т. 1, с. 95.

“нарожных” вежах Ніжняга замка, але яны на момант складання інвентара не былі завершаны і накрыты. Мураваныя сцены па ўсім перыметры стаялі ў зруйнаваным стане, ля Задунаўскай брамы меўся адрэзак астрогу, які ўжо пагніў і валіўся, а ў лініі паўднёвага прасла стаялі 2 “ізбіцы”. Пры гэтым значная частка перыметру замка не была ўвогуле ніяк абаронена. Карціна занядбання Ніжняга замка дапаўняецца апісаннем ставаў. Калі яшчэ ў 1594 г. існаваў млын на Віцьбе, якім валодалі сыны А. Вільчка[99], то ў 1638 г. грэблі на вусцях Віцьбы і Замкавага ручая былі прарваныя, і ставішчы стаялі без вады.

У першай палове XVII ст. рынкавая плошча ў заходняй частцы Ніжняга замка стала рэлігійным цэнтрам горада. Тут стаяла мураваная Дабравешчанская царква, перададзеная ў 1619 г. уніятам. Ля яе, як сведчыць інвентар 1638 г., узвялі драўляную званіцу, якую разам з храмам можна бачыць на чарцяжы 1664 г. На поўнач ад царквы размяшчаўся касцёл Святой Троіцы. Паводле інвентара 1638 г., ён згарэў у 1614 г., але намаганнямі Яна Завішы да 1626 г. быў адноўлены. Побач з касцёлам стаяў дом ксяндза. У другой палове XVI ст. на паўночным баку плошчы быў пастаўлены кальвінісцкі збор, ля якога меліся дом казнадзея і могілкі. Паміж царквой і зборам стаяла сінагога, дазвол на ўзвядзенне якой выдаў у 1630 г. тагачасны віцебскі ваявода Сымон Самуэль Сангушка[100]. Пры ім яўрэі пачалі актыўна засяляць тэрыторыю Ніжняга замка, а брама, што знаходзілася ля сінагогі, атрымала назву Жыдоўскай. На рынку ўсходняй часткі Ніжняга замка ў канцы 1630-х гг. шэраг пляцаў, у тым ліку пляц былой Пятніцкай царквы, быў перададзены ордэну езуітаў. Як сведчыць інвентар 1639 г., на той момант тут ужо быў закладзены дом “на кляштар”, які, па ўсёй верагоднасці, трэба атаясамліваць з двухпавярховым выцягнутым уздоўж замкавай сцяны домам, што адлюстраваны на чарцяжы 1664 г. У 1640-х гг. тут былі таксама пастаўлены драўляныя будынкі касцёла Святога Іосіфа і езуіцкай школы[101].

У 1654 г., з пачаткам новай вайны з Маскоўскай дзяржавай, былі зроблены чарговыя спробы направіць умацаванні Віцебскіх замкаў. Са сведчанняў шляхты 1664 г. некаторыя працы пры гэтым выконвалі мясцовыя яўрэі. Яшчэ да аблогі яны загардзілі 16 сажняў у абарончай лініі Ніжняга замка драўляным астрогам, а пасля яе пачатку – яшчэ 30 сажняў ля Жыдоўскай брамы „izbicami y obłamkami”. Таксама іх намаганнямі была адрамантавана сама брама, а побач зроблены патаемны выхад да Дзвіны для набірання вады. Акрамя таго на Верхнім замку яўрэі пабудавалі адну вежачку і дапамаглі ўзвесці

[99] *ИЮМ*, т. 20, с. 504.

[100] *ИЮМ*, т. 2, с. 225.

[101] W. Bobierski, *Architektura kościoła i kolegium jezuitów w Witebsku*, “Roczniki Humanistyczne” 50, 2002, z. 4, s. 326–327.

яшчэ некалькі аб’ектаў[102]. На гэтым прыкладзе добра бачна інтэнсіфікацыя прац па направе і адбудове ўмацаванняў непасрэдна пры ўзрастанні пагрозы нападу і ў час аблогі.

Аб мадэрнізацыі ўмацаванняў сведчыць маскоўскае апісанне 1655 г., зробленае неўзабаве пасля захопу Віцебска. Напярэдадні вайны 1654–1667 гг. маглі быць збудаваныя дзве драўляныя вежы на паўночна-заходнім баку Верхняга замка, якія, мяркуючы па значнай шырыні (18,4 і 21,6 м), хутчэй нагадвалі артылерыйскія бастэі. Ніжні замак быў цалкам абкружаны драўлянымі сценамі, па перыметры якіх былі пастаўлены драўляныя вежы для фланкіравання падыходаў да ўмацаванняў. Асаблівая ўвага надавалася ўмацаванню абароны з паўднёвага боку, дзе ў дадатак да трох вежаў, што стаялі на падмурках ранейшых мураваных, былі збудаваны яшчэ сем вежаў розных тыпаў шырынёй ад 5,4 да 8,6 м (2,5–4 саж.) (Гуркова малая, Княжая, Сапежынкава, Прасільная глухая, бык, вежа з падлазам, Падлазная). У выніку адлегласць паміж вежамі на гэтым прасле складала 39–86 м (18–40 саж.), што значна палепшыла магчымасць вядзення флангавага агню. Да 1654 г. паспелі дабудаваць і Завіцебную браму, паколькі на чарцяжы 1664 г. на гэтай вежы выразна бачны флюгер у форме герба ВКЛ “Пагоні”. У выніку, да пачатку маскоўскай аблогі Віцебскія замкі былі істотна ўмацаваныя. Нягледзячы на значныя разбурэнні, Верхні замак па-ранейшаму у значнай ступені




5. Віцебскія замкі па стане на другую палову XIV ст. Малюнак К. Макаравай па матэрыялах М. Волкава і М. Макарава, 2024 г.

102 *Акты издаваемые Виленскою археографическою комиссиею*, т. 5: *Акты Брестскаго и Городненскаго гродских судов*, Вильна 1871, с. 174.




6. Віцебскія замкі па стане на студзень 1655 г. Малюнак К. Макаравай па матэрыялах М. Волкава і М. Макарава, 2024 г.




7. Лакалізацыя замкавых умацаванняў XIV ст. на сучасным плане Віцебска. Малюнак К. Макаравай па матэрыялах М. Волкава і М. Макарава, 2024 г.

быў абаронены муравабымі сценамі, а таксама сям’ю драўлянымі вежамі, з якіх чатыры былі ўзведзены на ранейшых мураваных вежах або прыбудаваныя да іх. Фартыфікацыі Ніжняга замка былі цалкам дрэва-землянымі, а па яго перыметры налічвалася 14 вежаў розных тыпаў. Гэта дазволіла мясцоваму гарнізону дастаткова доўга і паспяхова абараняцца ад непрыяцеля (іл. 5, 6, 7).

## Насельніцтва замкаў

Па сваім прызначэнні замак з'яўляецца, у першую чаргу, рэзідэнцыяй і ваеннай базай. Аднак у выпадку Віцебска комплекс умацаванняў плошчай 11 га выконваў не толькі згаданыя функцыі. Верхні і Ніжні замкі былі ўзведзены на тэрыторыі "града" і пасадаў Віцебска, якія былі заселены са старажытнарускага часу. На працягу ўсяго перыяду свайго існавання яны мелі шчыльную драўляную забудову і былі заселены. Акрамя рэзідэнцыі вялікага князя і яго мясцовага ўрадніка тут размяшчаліся двары князёў і баяраў (шляхты) Віцебскай зямлі, а таксама гандляроў і рамеснікаў (мяшчан). Такім чынам, у XIV–XVII стст. у замках жылі прадстаўнікі розных саслоўяў і сацыяльных груп.

Тым не менш, пасля ўзвядзення мураваных умацаванняў прасочваецца тэндэнцыя да адсялення гандлёва-рамеснага насельніцтва з тэрыторыі замкаў. Так, тэкст Віцебскага земскага прывілея, які набыў сваю канчатковую форму не пазней за 1447 г., утрымлівае наступную ўнікальную пастанову (у вельмі блізкім па змесце прывілеі Полацкай зямлі яе аналага няма): "А местичовъ витебскихъ зъ города Витебска не вести вонъ"[103]. Наяўнасць такога пункта ў дакуменце, што ўтрымліваў асноўныя нормы віцебскага права і служыў гарантыяй захавання рэгіянальнай аўтаноміі, з'яўляецца маркерам вастрыні пытання. Па ўсёй верагоднасці, улады ў пэўны момант імкнуліся адсяліць частку гандляроў і рамеснікаў з тэрыторыі замкаў, але сутыкнуліся з кансалідаванай пазіцыяй віцяблян супраць гэтага і адмовіліся ад сваіх планаў. У выніку, у тэксце земскага прывілея з'явіліся адпаведныя гарантыі для мяшчан.

У 1551 г., згодна з распараджэннем Жыгімонта II Аўгуста, з тэрыторыі замкаў была вынесена частка гандлёвай інфраструктуры (у прыватнасці, заснаваны гасцінны двор на Узгорскім пасадзе), пра што ўжо было сказана вышэй. У сярэдзіне 1560-х гг., пад час Інфлянцкай вайны, існавалі нават праекты перасялення "за раку Віцьбу" часткі насельніцтва замкаў, а таксама ўсіх жыхароў перыферыйнай задзвінскай часткі Віцебска, з мэтай стварэння на Узгор'і адзінага, кампактнага і надзейна абароненага прыродай і штучнымі ўмацаваннямі мяшчанскага паселішча[104]. Аднак, па ўсёй верагоднасці, у сувязі з баявымі дзеяннямі гэтыя планы так і не былі рэалізаваны.

Да нашага часу захавалася значная колькасць дакументаў па аперацыях з нерухомай маёмасцю на тэрыторыі замкаў канца XVI – першай паловы XVII ст.[105] На іх падставе можна больш дэтальна вывучыць сацыятапаграфію

---

[103] М.Дз. Макараў, *Ад пасада да магдэбургіі…*, с. 55, 155.

[104] НГАБ, ф. КМФ-18, воп. 1, спр. 47, арк. 59–59 адв.; *Документы Московского архива Министерства юстиции...*, т. 1, с. 203.

[105] Яны зберагаюцца ў фондзе 1751 "Віцебскі земскі суд" Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (НГАБ, ф. 1751, воп. 1, спр. 1–22). Частка гэтых матэрыялаў апублікавана ў XIX ст. (*ИЮМ*, т. 20, 21, 22, 26).

замкаў, аднак гэта выходзіць за рамкі дадзенага артыкула. Неабходна толькі адзначыць, што ў гэты перыяд, згодна з нашымі назіраннямі, адбываўся паступовы працэс пераходу замкавых пляцаў з рук мяшчан у рукі шляхты праз здзелкі куплі-продажу.

Адносна цэльную карціну сацыяльнай стратыфікацыі насельніцтва Віцебскіх замкаў першых дзесяцігоддзяў XVII ст. даюць звесткі пра структуру нерухомай маёмасці на іх тэрыторыі з інвентара 1638 г. У Верхнім замку дакумент фіксуе 46 дамоў (лік даведзены да 47, але нумар 23 прапушчаны), а таксама 16 іншых аб'ектаў нерухомасці (царкву, арсенал, асобныя гаспадарчыя пабудовы, пустыя пляцы і інш). З гэтых 62 адзінак 34 (54,8%) знаходзілася ў руках шляхты, 14 (22,6%) – мяшчан, 4 (6,5%) – дзяржавы, ці замка, 5 (8%) – замкавых пушкароў, 1 (1,6%) – уніяцкай царквы, 4 (6,5%) – іншых катэгорый уласнікаў. У Ніжнім замку інвентар 1638 г. згадвае 90 дамоў (лік даведзены да 96, але нумары 38, 45, 66–69 прапушчаны, пад некаторымі нумарамі фігуруе адразу некалькі жылых пабудоў), а таксама 24 іншыя аб'екты нерухомасці, хоць і тут пад асобнымі нумарамі ў некалькіх выпадках выступаюць цэлыя групы аб'ектаў. Са згаданых 114 адзінак нерухомай маёмасці 71 (62,3%) належала шляхце, 23 (20,2%) – мяшчанам, 8 (7%) – храмам розных канфесій, 12 (10,5%) – іншым катэгорыям уласнікаў і асобам, чый статус на падставе звестак інвентара вызначыць немагчыма.

Вельмі цікавым рудыментам "службовай" сістэмы (пра яе падрабязна – ніжэй), вядомым з інвентара 1638 г., а таксама пазнейшых крыніц[106], з'яўляецца наяўнасць у XVII ст. на тэрыторыі Віцебскіх замкаў некалькіх аб'ектаў, што належылі сялянам вёскі Узварцы[107] як калектыўнаму ўласніку. Так у Верхнім замку знаходзіліся "puni dwie vzwareckich chłopow", а ў Ніжнім – "dom poddanych vzwarzeckich". Паводле вызначэння "Гістарычнага слоўніка беларускай мовы", "взварец" – гэта "асоба, якая займалася вытворчасцю піва, брагі, віна і іншых хмельных напіткаў"[108]. Таму, на падставе назвы згаданай вёскі можна дапусціць, што ў XIV–XVI стст. яе насельніцтва несла спецыялізаваную павіннасць па забеспячэнні замка як вялікакняскай рэзідэнцыі і ваеннай базы падобнай прадукцыяй, а пляцоўкі на замках віцебскія ўзварцы атрымалі менавіта ў сувязі з выкананнем сваёй службы.

Прынцыповыя і вельмі хуткія змены ў сацыяльнай структуры насельніцтва Ніжняга замка адбыліся пад сярэдзіну XVII ст. У 1637 г. пры рынку ў яго ўсходняй частцы быў заснаваны езуіцкі калегіўм. За наступнае дзесяцігоддзе ён атрымаў шчодрыя ахвяраванні ў выглядзе замкавых пляцаў ад Уладзіслава IV Вазы, уніяцкага архіепіскапа Антонія Сялявы і прадстаўнікоў шляхецкіх

[106] НГАБ, ф. 1751, воп. 1, спр. 23, арк. 569 адв.
[107] Вёска Узварцы існавала да 1950-х гг. на тэрыторыі Ноўкінскага сельсавета Віцебскага раёна.
[108] *Гістарычны слоўнік беларускай мовы*, т. 3: *Вариво–Вкупе*, Мінск 1983, с. 182.

родаў Віцебскага ваяводства, а таксама пэўную колькасць участкаў езуіты набылі за ўласныя сродкі. У выніку, да 1650 г. яны фактычна мелі ва ўладанні сектар паміж Завіцебным і Задунайскім адгалінаваннямі вуліцы Вялікай агульнай плошчай каля 2 га і распачалі ўзвядзенне комплекса калегіўма, а ранейшае насельніцтва пляцоўкі мусіла ў сувязі з гэтым змяніць месца жыхарства[109].

## Сістэма забеспячэння замкаў

Разам з пабудовай Віцебскіх замкаў была створана сістэма забеспячэння неабходнымі для іх існавання, як рэзідэнцыі і ваеннай базы, рэсурсамі і паслугамі. Яна дзейнічала за кошт ускладання шэрагу натуральных павіннасцяў на насельніцтва Віцебскай зямлі. У рамках гэтай сістэмы некаторыя павіннасці (напрыклад, "гарадавая") з-за вялікага аб'ёма работ закранралі ўсё насельніцтва зямлі ці, па меншай меры, значную яго частку. Іншыя спецыфічныя "службы" мусіла выконваць толькі дакладна вызначанае кола асобаў, напрыклад, жыхары канкрэтных вёсак.

Замкавыя ўмацаванні неабходна было ўвесь час падтрымліваць у належным стане. І калі да працы па рамонце іх мураваных элементаў, як паказалі згаданыя вышэй падзеі 1470 г., патрэбна было прыцягваць майстроў адпаведнай кваліфікацыі, і нават з замежжа, то з перыядычным ўзвядзеннем гародняў і вастраколаў на ўчастках, дзе мураванай сцяны не было, можна было справіцца мясцовымі сіламі. Павіннасць па забудове такіх адрэзкаў абарончага перыметра замка, агульная даўжыня якіх дасягала 700 м і з часам павялічвалася, раскладалася ў рамках пэўнай цэнтралізаванай сістэмы на насельніцтва Віцебскай зямлі (сялян розных валасцей, мяшчан і інш.).

Як сведчаць дакументы 1530–1550-х гг., значную частку гародняў у лініі ўмацаванняў замкаў традыцыйна ўзводзілі Азярышчанская і Усвяцкая воласці (1555 г. – "они здавна повинъни суть замъку витебъскому чотыри недели робити, то естъ у лесе две недели дерево при тесли городовом готовити, а другие две недели у замъку робити"). Нават тое, што ў азначаны час згаданыя воласці знаходзіліся ў распараджэнні каралевы Боны Сфорца і не падлягалі юрысдыкцыі віцебскіх ваяводаў, не здымала з азярышчанскіх і ўсвяцкіх валашчан гэтага абавязку[110]. У пачатку XVI ст. частку гародняў мусілі будаваць жыхары сяла Гарадзецкага. І калі апошнія ў ходзе чарговага рамонта ўмацаванняў "дельницъ своихъ въ томъ замку водле стародавного обычая заробити не хотели", віцебскі ваявода Іван Багданавіч

[109] W. Bobierski, *op. cit.*, s. 325–327.

[110] НГАБ, ф. КМФ-18, воп. 1, спр. 32, арк. 38 адв. (1535 г.); спр. 36, арк. 81 адв. (1555 г.).

Сапега канфіскаваў у іх 14 коней і вала і за кошт сродкаў атрыманых ад іх продажу аплаціў адпаведныя работы[111]. У 1570–1580-я гг. доля віцебскіх мяшчан ва ўзвядзенні дрэва-земляной часткі ўмацаванняў Верхняга замка складала 5 гародняў. Цікава, што мяшчане не будавалі іх уласнымі сіламі, а збіралі грошы і пры пасярэдніцтве войта наймалі работнікаў[112]. На жаль, парадак раскладкі "гарадавой" павіннасці на насельніцтва Віцебшчыны не можа быць адноўлены ў поўным аб'ёме з прычыны фрагментарнасці крыніц XV–XVI стст.

Аналагічная сістэма па забеспячэнні дрэва-земляных умацаванняў Полацкага замка існавала на тэрыторыі суседняй Полацкай зямлі. Вядома, што ў 1533 г. у полацкага гараднічага захоўваліся "списки", складзеныя незадоўга да таго полацкім ваяводам Пятром Кішкам, "в которыхъ выписано, хто с кимъ а колько городенъ в томъ замъку маеть робити"[113]. Маштаб гэтай сістэмы ў рамках Полацкай зямлі, хоць і на фінальнай стадыі яе існавання, дазваляюць ацаніць матэрыялы Полацкай рэвізіі 1552 г.[114]

У другой палове XVI – пачатку XVII ст. у Віцебску сістэма ўзвядзення і рамонту драўлянай часткі ўмацаванняў за кошт натуральнай павіннасці насельніцтва з-за разарэння і часовага захопу непрыяцелем асобных валасцей у ходзе войн, а таксама паступовага пашырэння прыватнага землеўладання ўжо фактычна не функцыянавала. Таму адпаведныя адрэзкі абарончага перыметра замкаў, як паказвае інвентар 1638 г., забудоўваліся ўладамі ў экстраардынарным парадку з прыцягненнем дадатковага фінансавання.

Менш аб'ёмныя павіннасці на замак, як правіла, выконваліся насельніцтвам асобных вёсак. Гэтыя "службы" былі для жыхароў такіх паселішчаў традыцыйнымі, што знаходзіла адлюстраванне ў іх назвах: Жабянцяі, Сакольнікі, Псарцы, Узварцы. Ва ўсіх выпадках за сваю службу яны атрымлівалі надзелы зямлі. Як адзначалася на пасяджэнні суда віцебскага ваяводы 5 жніўня 1532 г., "жибеньтяи, узваръцы, псаръцы и инъшие люди на служъбы свои особные земли приданые мають"[115].

Найбольш важнай замкавай "службай" лічыліся жабянцяі, якія кампактна пражывалі ў вёсцы з адпаведнай назвай[116]. У 1530 г. віцебскі ваявода Ян Юр'евіч Глябовіч апісаў функцыі жабянцяяў наступным чынам: "естъ межи инъшими потребнейши господару его милости для сторожы и инъшое послуги, кгды бы господаръ его милость до замку Вытебъского приехалъ,

[111] *Беларускі архіў...*, т. 2, с. 40.

[112] Центральний державний історичний архів України, ф. 48, оп. 1, од. зб. 120, арк. 1–2. Дзякуем Раману Захарчанку-Ушалеўскаму за ўказанне на гэтую крыніцу.

[113] *Беларускі архіў...*, т. 2, с. 124.

[114] *Полоцкая ревизия 1552 года*, подгот. И.И. Лаппо, Москва 1905, с. 1–11.

[115] *Беларускі архіў...*, т. 2, с. 98.

[116] Вёска Жабянцяі ўваходзіць у склад Бабініцкага сельсавета Віцебскага раёна.

альбо тежъ и воевода, который на Вытебъску будеть"[117]. У інвентары 1638 г. гаворыцца, што жыхары вёскі Жабянцяі "pod czas bytnosci Pana woiewodziney powinni na strozą isc". Такім чынам, гэта служба была цесна звязана з уладай вялікага князя, яго віцебскай рэзідэнцыяй і мясцовымі намеснікамі. Слова "жабянцяй" мае літоўскае паходжанне (ад "žibintas"="ліхтар"). В.А. Варонін выказаў меркаванне, што жабянцяі былі слугамі, ў абавязкі якіх "уваходзіла ацяпленне і асвятленне дома"[118]. На наш погляд, асноўнай павіннасцю жабянцяяў з самага пачатку было нясенне старожы на замку (у тым ліку, у начны час з ліхтарамі і паходнямі) пад час знаходжання вялікага князя ці яго намесніка. Акрамя Віцебска, па звестках інвентароў XVII ст., жабянцяі меліся ва Усвятах[119], дзе таксама пэўны час княжыў Альгерд[120], а адным з забойцаў Кейстута ў 1382 г. стаў слуга Ягайлы Лісіца Жабянцяй[121]. Адзначым, што ўсе згадкі пра іх звязаны выключна з вотчыннымі ўладаннямі Альгердавічаў. Верагодна, віцебскіх жабянцяяў трэба лічыць нашчадкамі літоўцаў, якіх Альгерд прывёў з сабой у Віцебскую зямлю, калі стаў мясцовым князем.

Службы сакольнікаў і псарцоў былі звязаны з паляваннем вялікага князя, а пазней, магчыма, і яго намеснікаў[122]. Неабходна дадаць, што да паляўнічай інфраструктуры замка належыў так званы "Звярынец", дзе ўтрымліваліся дзікія жывелы. Як можна меркаваць на падставе тапанімікі канца XVI – пачатку XVII ст., ён знаходзіўся на правым беразе Дзвіны насупраць Верхняга замка[123]. Узварцы, пра якіх ужо вялася размова вышэй, забяспечвалі рэзідэнцыю напоямі. Рагацціннікі ў рамках сваёй службы павінны былі вырабляць і аддаваць на замак пэўную колькасць рагацін у год[124]. Існавалі таксама іншыя традыцыйныя замкавыя "службы" (конюхі, кавалі, перавозчыкі і інш.).

З развіццём агняпальнай зброі вельмі важнае значэнне ў сістэме забеспячэння Віцебскіх замкаў набылі пушкары. Першыя згадкі пра іх у Віцебску адносяцца да пачатку XVI ст. Так, у 1514 г. у Верхнім замку меў двор "лідскі" пушкар[125], які, верагодна, раней служыў пры Лідскім замку, але

[117] *Беларускі архіў...*, т. 2, с. 16.

[118] *Судебная книга витебского воеводы, господарского маршалка, волковыского и оболецкого державцы М.В. Клочко...*, с. 417.

[119] *ИЮМ*, т. 21, с. 83–84.

[120] В. Варонін, *Княжанне Альгерда ў Віцебску...*, с. 4–14.

[121] *Полное собрание русских летописей...*, т. 32, с. 143.

[122] Вёскі з назвай Сакольнікі ёсць у Акцябрскім і Мазалаўскім сельсаветах Віцебскага раёна. Вёска Псарцы існавала да сярэдзіны XX ст. на тэрыторыі Мазалаўскага сельсавета Віцебскага раёна.

[123] *ИЮМ*, т. 31, Витебск 1903, с. 69.

[124] НГАБ, ф. КМФ-18, воп. 1, спр. 249, арк. 483–486.

[125] *Lietuvos metrika. Knyga 9: (1511–1518). Užrašytų knyga 9*, wyd. K. Pietkiewicz, Vilnius 2002, s. 278.

быў накіраваны ў Віцебск для ўмацавання мясцовай фартэцыі. Ім мог быць пушкар Ошман, які згадваецца ў 1517 г. у сувязі з канфліктам з мясцовым ксяндзом. Апошні скардзіўся, што пушкар бяспраўна трымаў карчму, аднак той спасылаўся на дазвол на гэта віцебскага ваяводы Івана Сямёнавіча Сапегі[126]. Гэты канфлікт сведчыць пра адзін з найбольш распаўсюджаных у ВКЛ у першай палове XVI ст. спосабаў забеспячэння пушкароў – праз дазвол на рознічны гандаль алкагольнымі напоямі.

У 1528 г. у Віцебску было ўжо некалькі пушкароў, якім, паводле загаду ваяводы, мяшчане павінны былі даваць катлы, дровы і попел для вырабу салетры[127]. Адпаведна, адным з абавязкаў пушкароў быў выраб пораху. Пушкары Іван і Макар згадваюцца ў 1530 г., Анікей Каньковіч, Андрэй Скіндэр і Міклаш Чэх – у 1531 г. Пры гэтым адзначаецца, што яны валодалі землямі ля горада, якія сталі адным са сродкаў утрымання пушкароў на службе[128]. Па пазнейшых згадках бачна, што ў Віцебску пачыналі фарміравацца пушкарскія дынастыі. Так, у 1533 і 1541 гг. згадваецца Кузьма Міклашоў сын[129], або Міклашэвіч, які трымаў дзве зямлі на пушкарскай службе[130]. У 1560 г. у Віцебску збройнікам служыў Балтрамей Міклашэвіч[131]. У 1594 г. ён ужо названы пушкаром і да таго ж меў пляц на Верхнім замку[132]. Паколькі направа агняпальнай зброі ўваходзіла ў абавязакі пушкароў, такая змена прафесіі выглядае досыць натуральнай. У 1533 г. згадваецца таксама пушкар Канко "з памочнікамі"[133], які мог прыходзіцца бацькам згаданаму вышэй Анікею Каньковічу.

Дастаткова вялікая колькасць пушкароў, якія стала пражывалі ў Віцебску ў 1530-х гг., сведчыць пра яго значны ваенны патэнцыял. У час войнаў практыкаваўся найм дадатковых спецыялістаў. Вядома, што 1537 г. у Віцебску служылі нанятыя гаспадаром пушкары немцы Ганус і Антоній, якія першапачаткова атрымлівалі па 50 злотых на год, але хацелі пакінуць

---

126 *Русская историческая библиотека*, т. 20: *Литовская Метрика*, ч. 1, Санкт-Петербург 1903, стлб. 483–484, 505–507.

127 *Lietuvos metrika. Knyga 224: (1522–1530): 4-oji Teismų bylų knyga (XVI a. pabajgos kopija)*, wyd. S. Lazutka, I. Valikonytė ir kt., Vilnius 1997, s. 260.

128 *Беларускі архіў...*, т. 2, с. 25, 67, 75, 83–84, 102.

129 *Судебная книга витебского воеводы, господарского маршалка, волковыского и оболецкого державцы М.В. Клочко...*, с. 77–78.

130 *Lietuvos metrika. Knyga 24: (1540–1544). Užrašytų knyga 24*, wyd. A. Dubonis, D. Antanavičius, Vilnius 2013, s. 127.

131 D. Baronas, *Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės puškoriai Žygimanto Augusto laikais (1548–1572)*, "Karo archyvas" 15, 1998, s. 28.

132 *ИЮМ*, т. 20, с. 505. У публікацыі не да канца расчытана яго прозвішча: "Бартоша Микла… ча".

133 *Судебная книга витебского воеводы, господарского маршалка, волковыского и оболецкого державцы М.В. Клочко...*, с. 356.

службу, у сувязі з чым манарх загадаў полацкаму мытніку павысіць ім заробак яшчэ на 10 злотых і забяспечыць сукном[134]. Напачатку Інфлянцкай вайны ў 1559 г. прадстаўнікі Віцебскага павету прасілі гаспадара забяспечыць замкі пушкарамі[135]. З крыніц 1561 г. вядома, што наймам пушкароў для Віцебскіх замкаў займаўся ваявода Стафан Збаражскі. Пры ім былі нанятыя Юрка Парфенавіч, Іван Мякоцін, Іван Анціпаў і Андрэй Юркаў. Яны павінны былі даглядаць гакаўніцы і вырабляць на год па 50 фунтаў пораху кожны. За гэта ім плацілі па 15 коп грошаў, а старшым пушкарам Ю. Парфенавічу і А. Юркаву давалі яшчэ па 7 локцяў люнскага сукна. Заробак ім павінен быў выплочваць полацкі мытнік, які, аднак, паводле дакументаў не выконваў свае абавязкі спраўна[136]. У 1565 г. згадваецца пушкар Багдан Асяевіч, які меў тыя ж абавязкі і заробак, але прасіў гаспадара дадаткова надзяліць яго зямлёй, якую б ён мог перадаць у спадчыну сваім дзецям з абавязкам нясення пушкарскай службы[137]. Яго просьба была выканана, паколькі пад 1598 г. ёсць згадка пра вызначэнне граніц зямель Багдана Асеева[138].

У першай палове XVII ст. віцебскіх пушкароў актыўна прыцягвалі да службы ў палявой арміі ў час войнаў. Згадка аб гэтым маецца ў дакуменце 1616 г.[139] У 1635 г. у Віцебску было нанята 14 пушкароў. Для параўнання, у тую ж выправу былі завербаваны таксама 6 аршанскіх і 8 магілёўскіх пушкароў[140]. Паводле інвентара 1638 г. на Верхнім замку пушкары мелі тры хаты, адну клець і пусты пляц, якія былі ім патрэбны для выканання сваіх абавязкаў у ваенны час. Свае дамы большасць з іх мела ва Ўзгорскім пасадзе, у прыватнасці ў інвентарах 1638 і 1641 гг. там згадваецца 8 пушкарскіх дамоў, адзін належаў удаве пушкара, а яшчэ адзін пушкар жыў у Слабадскім пасадзе за Дзвіной[141]. На пачатку вайны 1654 г. у Віцебску налічвалася 42 пушкары, якія ўзялі ўдзел у абароне замкаў[142]. Аднак тут, відавочна, улічаны ўсе мужчыны, якія жылі на пушкарскіх пляцах. Крыху пазней, у 1665 г., саміх пушкарскіх двароў налічвалася 23[143]. Варта адзначыць, што пытанні забеспячэння пушкароў зямельнымі надзеламі і вызначэння іх абавязкаў

[134] *Ibidem*, c. 88–92.
[135] *Витебская старина...*, т. 1, с. 54.
[136] *Lietuvos metrika. Knyga 37: (1552–1561). Užrašytų knyga 37*, wyd. D. Baronas, Vilnius 2011, c. 451–452.
[137] *ИЮМ*, т. 21, с. 254–256.
[138] *ИЮМ*, т. 21, с. 471.
[139] AGAD, AR, dz. II, ks. 11, s. 83.
[140] AGAD, AR, dz. II Supl., sygn. 502, s. 18–19.
[141] Інвентар 1641 г., гл.: *Витебская старина...*, т. 1, с. 359–360.
[142] М.А. Ткачев, *Белорусский феодальный город XIV–XVIII веков…*, с. 139.
[143] А.М. Карпачев, *Русские переписные книги как источник для демографического изучения городов Белоруссии второй половины XVII в.*, в: *Вопросы архивоведения и источниковедения в БССР*, Минск 1971, с. 324.

вырашаліся асабіста манархам. У прыватнасці, у пачатку XVIII ст. віцебскія пушкары спасылаліся на каралеўскія прывілеі, пачынаючы ад Жыгімонта II Аўгуста. Пры гэтым згадвалася, што на той час некаторыя з іх ужо жылі за горадам[144]. Адзін з першых фактаў надзялення пушкара зямлёй за горадам зафіксаваны пад 1541 г.[145] Верагодна, актыўна валокамі на ўмовах нясення службы пушкароў надзяляў Жыгімонт II Аўгуст. У выніку гэтых наданняў побач з Віцебскам паўсталі тры вёскі з назвай Пушкары[146].

## Высновы

Такім чынам, у XIV ст. у Віцебску быў узведзены магутны абарончы комплекс, які складаўся з Верхняга і Ніжняга замкаў і займаў плошчу 11 га. Агульная даўжыня абарончага перыметра дасягала 2 км, з якіх 1,3 км былі забяспечаны муравамымі умацаваннямі, у тым ліку не менш за 10 муравамымі вежамі розных тыпаў. Будаўніцтва мураванага комплекса не было завершана, у выніку 26% абарончага перыметра лініі Верхняга замка, а таксама 41% умацаванняў Ніжняга замка заўсёды былі драўлянымі. Магутнасці віцебскім ўмацаваннямі дадавалі прыродныя перашкоды, дапрацаваныя чалавекам. На працягу стагоддзяў замкі некалькі разоў мянялі свае функцыі. Яны ўзводзіліся як рэзідэнцыя Альгерда ў адным з галоўных цэнтраў яго вотчынных уладанняў, а ў XVI–XVII стст. працягвалі функцыянаваць як дзяржаўная фартэцыя ВКЛ. Гэтыя змены аказалі значны ўплыў на сістэму будаўніцтва і забеспячэння ўмацаванняў, якая паступова эвалюцыянавала ад натуральных павіннасцяў насельніцтва зямлі да экстраардынарных мер і прыцягнення дадатковага фінансавання. За сваю гісторыю Віцебскія замкі вытрымалі шмат непрыяцельскіх аблог, у тым ліку, з выкарыстаннем цяжкой артылерыі. Аднак іх галоўным ворагам стаў час, які на фоне адсутнасці сістэмы догляду за мураванымі канструкцыямі прывёў да паступовага разбурэння і заняпаду ўмацаванняў некалі непрыступнай фартэцыі.

### Рэзюмэ

У артыкуле зроблена спроба на падставе пісьмовых крыніц і вынікаў археалагічных раскопак аднавіць першапачатковы выгляд Віцебскіх мураваных замкаў XIV ст. і разгледзець трансфармацыю іх архітэктуры ў перыяд да сярэдзіны XVII ст. У XIV ст. у Віцебску быў узведзены абарончы комплекс, які складаўся з Верхняга і Ніжняга замкаў і займаў плошчу каля 11 га. Яго перыметр прыкрывалі прыродныя перашкоды, дапрацаваныя чалавекам, мураваныя

144 *ИЮМ*, т. 19, с. 426–427.
145 *Lietuvos metrika. Knyga 24: (1540–1544)…*, s. 127.
146 Вёскі з назвай Пушкары знаходзяцца ў Астровенскім сельсавеце Бешанковіцкага раёна, Воронаўскім і Ноўкінскім сельсаветах Віцебскага раёна.

і драўляныя сцены агульнай даўжынёй каля 2 км і не менш за 10 мураваных вежаў. Будаўніцтва комплекса не было завершана, і 26% абарончай лініі Верхняга замка, а таксама 41% умацаванняў Ніжняга замка заўсёды былі драўлянымі. На працягу стагоддзяў Віцебскія замкі некалькі разоў мянялі свае функцыі. Яны ўзводзіліся як рэзідэнцыя Альгерда ў адным з галоўных цэнтраў яго вотчынных уладанняў, а ў XVI–XVII стст. фактычна працягвалі функцыянаваць як дзяржаўная фартэцыя ВКЛ. Галоўнымі прычынамі паступовага разбурэння і знікнення замкавых умацаванняў сталі час і адсутнасць сістэмы догляду за іх мураванай часткай.

У артыкуле таксама разгледжаны сацыяльная структура насельніцтва Віцебскіх замкаў і функцыянаванне службаў, звязаных з іх забеспячэннем неабходнымі рэсурсамі і паслугамі. У XIV–XVII стст. замкі былі шчыльна забудаваныя. Акрамя рэзідэнцыі вялікага князя і яго мясцовага ўрадніка тут размяшчалася аб’екты нерухомасці, што належылі шляхце, мяшчанам, царкве і іншым катэгорыям уласнікаў. Сістэма будаўніцтва і забеспячэння ўмацаванняў у XIV–XVII стст. паступова эвалюцыянавала ад натуральных павіннасцяў насельніцтва зямлі да экстраардынарных мер і прыцягнення дадатковага фінансавання.

## The Viciebsk Castles in the Fourteenth – First Half of the Seventeenth Centuries: Architecture and Society (Summary)

Based on the written sources and the results of archaeological excavations, the article examines the initial appearance of Viciebsk masonry castles in the fourteenth century and their transformation in the period up to the middle of the seventeenth century. The powerful complex of masonry fortifications was built in Viciebsk in the fourteenth century. It included the Upper and Lower Castles and occupied an area of about 11 hectares. Its perimeter was covered by natural obstacles, fortified by men, brick and wooden walls with a total length of about 2 km and at least 10 brick towers. The construction of masonry fortifications was not completed, and 26% of the defense line of the Upper Castle, as well as 41% of the fortifications of the Lower Castle, always remained wooden. Over the centuries, Viciebsk castles changed their functions several times. They were built as Alhierd’s residence in one of the main centers of his patrimonial possessions, and in the sixteenth and seventeenth centuries they actually continued to function as a state fortress of the Grand Duchy of Lithuania. The main reasons for the gradual destruction and disappearance of castle fortifications were time and absence of a system of care for their masonry part.

The article also examines the social structure of the population of Viciebsk castles and the functioning of services related to providing them with the necessary resources and services. In the fourteenth–seventeenth centuries, the castles were densely populated. In addition to the residence of the monarch and his local government official, real estate belonging to the nobility, burghers, church and other categories of owners was located here. The system of building and providing fortifications in the fourteenth–seventeenth centuries gradually evolved from the natural duties of the population of the land to extraordinary measures and attracted additional funding.

# Бібліяграфія

## Архіўныя крыніцы

Archiwum Główne Akt Dawnych, Archiwum Radziwiłłów, dz. II, ks. 11; dz. II Supl., sygn. 502; dz. X, sygn. 598.

Riksarkivet, Extranea IX Polen, vol. 105.

Государственный архив Тверской области, ф. 1409, оп. 1, д. 1521.
Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, ф. 1751, воп. 1, спр. 12, 23; ф. КМФ-18, воп. 1, спр. 32, 36, 47, 60, 249.
Российский государственный архив древних актов, ф. 192, оп. 1, Витебская губ., № 2.
Центральний державний історичний архів України, ф. 48, оп. 1, од. зб. 120.

## Друкаваныя крыніцы

*Archiwum książąt Lubartowiczów Sanguszków w Sławucie*, t. 4: *1535–1547*, t. 7: *1554–1572*, Lwów 1890, 1910.
*Lietuvos metrika. Knyga 5: (1427–1506). Užrašymų knyga 5*, wyd. E. Banionis, Vilnius 1993.
*Lietuvos metrika. Knyga 9: (1511–1518). Užrašymų knyga 9*, wyd. K. Pietkiewicz, Vilnius 2002.
*Lietuvos metrika. Knyga 24: (1540–1544). Užrašymų knyga 24*, wyd. A. Dubonis, D. Antanavičius, Vilnius 2013.
*Lietuvos metrika. Knyga 37: (1552–1561). Užrašymų knyga 37*, wyd. D. Baronas, Vilnius 2011.
*Lietuvos metrika. Knyga 224: (1522–1530). 4-oji Teismų bylų knyga (XVI a. pabajgos kopija)*, wyd. S. Lazutka, I. Valikonytė ir kt., Vilnius 1997.
Stryjkowski M., *Kronika polska, litewska, żmódzka i wszystkiej Rusi*, t. 2, Warszawa 1846.
VL, t. 4, Petersburg 1854.

*Акты издаваемые Виленскою археографическою комиссиею*, т. 5: *Акты Брестскаго и Городненскаго гродских судов*, Вильна 1871 / *Akty izdavaemye Vilenskoi͡u arkheograficheskoi͡u komissiei͡u*, t. 5: *Akty Brestskago i Gorodnenskago grodskikh sudov*, Vil'na 1871.
*Беларускі архіў*, т. 2: *Літоўская метрыка (XV–XVI ст.)*, выд. З. Даўгяла, Мінск 1928 / *Belaruski arkhiŭ*, t. 2: *Litoŭskai͡a metryka (XV–XVI st.)*, vyd. Z. Daŭhi͡ala, Minsk 1928.
*Витебская старина*, т. 1, 4, 5, сост. и изд. А.П. Сапунов, Витебск 1883, 1885, 1888 / *Vitebskai͡a starina*, t. 1, 4, 5, sost. i izd. A.P. Sapunov, Vitebsk 1883, 1885, 1888.
*Віцебска-Рыжскія акты XIII–XVII ст.: дагаворы і службовая карэспандэнцыя паміж органамі кіравання горада Віцебска і ганзейскага горада Рыгі (з былога комплекса Ruthenica Дзяржаўнага Гістарычнага Архіва Латвіі)*, т. 1, падрыхт. А. Дзярновіч, Мінск 2005 / *Vitsebska-Ryz͡hskii͡a akty XIII–XVII st.: dahavory i sluz͡hbovai͡a karėspandėntsyi͡a pamiz͡h orhanami kiravanni͡a horada Vitsebska i hanzeĭskaha horada Ryhi (z byloha kompleksa Ruthenica DZi͡arz͡haŭnaha Histarychnaha Arkhiva Latvii)*, t. 1, padrykht. A. Dzi͡arnovich, Minsk 2005.
*Документы Московского архива Министерства юстиции*, т. 1, подгот. М. Довнар-Запольский, Москва 1897 / *Dokumenty Moskovskogo arkhiva Ministerstva i͡ustit͡sii*, t. 1, podgot. M. Dovnar-Zapol͡skiĭ, Moskva 1897.
*Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской*, т. 1, 2, 19, 20, 21, 22, 26, 31, Витебск 1871–1903 / *Istoriko-i͡uridicheskie materialy, izvlechennye iz aktovykh knig guberniĭ Vitebskoĭ i Mogilevskoĭ*, t. 1, 2, 19, 20, 21, 22, 26, 31, Vitebsk 1871–1903.
*Метрыка Вялікага Княства Літоўскага: кніга № 35 (1551–1558): кніга запісаў № 35 (копія канца XVI ст.)*, падрыхт. А.А. Мяцельскі, Мінск 2020 / *Metryka Vi͡alikaha Kni͡astva Litoŭskaha: kniha № 35 (1551–1558): kniha zapisaŭ № 35 (kopii͡a kantsa XVI st.)*, padrykht. A.A. Mi͡atsel͡ski, Minsk 2020.
*Полное собрание русских летописей*, т. 32: *Хроники: Литовская и Жмойтская, и Быховца. Летописи: Баркулабовская, Аверки и Панцырного*, Москва 1975 / *Polnoe sobranie russkikh letopiseĭ*, t. 32: *Khroniki: Litovskai͡a i Zhmoĭtskai͡a, i Bykhovt͡sa. Letopisi: Barkulabovskai͡a, Averki i Pant͡syrnogo*, Moskva 1975.

*Полоцкая ревизия 1552 года*, подгот. И.И. Лаппо, Москва 1905 / *Polot͡skai͡a revizii͡a 1552 goda*, podgot. I.I. Lappo, Moskva 1905.
*Русская историческая библиотека*, т. 20: *Литовская Метрика*, ч. 1, Санкт-Петербург 1903 / *Russkai͡a istoricheskai͡a biblioteka*, t. 20: *Litovskai͡a Metrika*, ch. 1, Sankt-Peterburg 1903.
*Сборник Императорского Русского Исторического Общества*, т. 35: *Памятники дипломатических сношений древней России с державами иностранными. 1. Памятники дипломатических сношений Московского государства с Польско-Литовским государством в царствование великого князя Ивана Васильевича*, ч. 1: *Годы с 1487 по 1533*, Санкт-Петербург 1882 / *Sbornik Imperatorskogo Russkogo Istoricheskogo Obshchestva*, t. 35: *Pami͡atniki diplomaticheskikh snosheniĭ drevneĭ Rossii s derzhavami inostrannymi. 1. Pami͡atniki diplomaticheskikh snosheniĭ Moskovskogo gosudarstva s Pol'sko-Litovskim gosudarstvom v t͡sarstvovanie velikogo kni͡azi͡a Ivana Vasil'evicha, ch. 1: Gody s 1487 po 1533*, Sankt-Peterburg 1882.
*Судебная книга витебского воеводы, господарского маршалка, волковысского и оболецкого державцы М.В. Клочко. 1533–1540 (Литовская метрика. Книга № 228. Книга судных дел № 9)*, подгот. В.А. Воронин, А.И. Груша, И.П. Старостина, А.Л. Хорошкевич, Москва 2008 / *Sudebnai͡a kniga vitebskogo voevody, gospodarskogo marshalka, volkovyskogo i obolet͡skogo derzhavt͡sy M.V. Klochko. 1533–1540 (Litovskai͡a metrika. Kniga № 228. Kniga sudnykh del № 9)*, podgot. V.A. Voronin, A.I. Grusha, I.P. Starostina, A.L. Khoroshkevich, Moskva 2008.

## Літаратура

Baronas D., *Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės puškoriai Žygimanto Augusto laikais (1548–1572)*, "Karo archyvas" 15, 1998, s. 24–50.
Bobierski W., *Architektura kościoła i kolegium jezuitów w Witebsku*, "Roczniki Humanistyczne" 50, 2002, z. 4, s. 323–358.
Jasnowski J., *Materjały do działalności wojskowej Floriana Zebrzydowskiego*, „Przegląd Historyczno-Wojskowy" 9, 1937, z. 2, s. 267–304.
Łopatecki K., *Okoliczności powstania i przydatność wojskowa mapy Descriptio Ducatus Polocensis Stanisława Pachołowieckiego (1580)*, „Terminus" 19, 2017, z. 1(42), s. 75–126.
Mikulski W., Zawadzki J., *Opisy zamków białoruskich z inwentarzy dóbr przechowywanych w Archiwum Radziwiłłów w Archiwum Głównym Akt Dawnych*, Warszawa 1999.
Volkau M., *Murowane zamki na tle rozwoju państwa i społeczeństwa w Wielkim Księstwie Litewskim w XIV – pierwszej połowie XVI wieku*, w: *Stan badań nad wielokulturowym dziedzictwem dawnej Rzeczypospolitej*, t. 16, red. W. Walczak, K. Wiszowata-Walcza, Białystok 2023, s. 577–595.
Volkau M., *Zamki i drogi na białoruskim Podźwiniu w czasie wojny inflanckiej (1558–1583)*, "Zapiski Historyczne" 88, 2023, z. 3, s 27–57.

Бохан Ю.М., *Вайсковая справа ў Вялікім княстве Літоўскім у другой палове XIV – канцы XVI ст.*, Мінск 2008 / Bokhan I͡u.M., *Vaĭskovai͡a sprava ŭ Vi͡alikim kni͡astve Litoŭskim u druhoĭ palove XIV – kantsy XVI st.*, Minsk 2008.
Бубенько Т.С., *Средневековый Витебск. Посад – Нижний замок (X – первая половина XIV в.)*, Витебск 2004 / Buben'ko T.S., *Srednevekovyĭ Vitebsk. Posad – Nizhniĭ zamok (Kh – pervai͡a polovina XIV v.)*, Vitebsk 2004.
Варонін В.А., *Падзеі вайны 1512–1522 гадоў у Беларускім Падзвінні*, "Studia Historica Europae Orientalis" 6, 2013, с. 192–218 / Varonin V.A., *Padzei vaĭny 1512–1522 hadoŭ u Belaruskim Padzvinni*, "Studia Historica Europae Orientalis" 6, 2013, s. 192–218.
Варонін В., *Княжанне Альгерда ў Віцебску*, "Беларускі гістарычны часопіс" 2013, № 7, с. 4–14 / Varonin V., *Kni͡azhanne Al'herda ŭ Vitsebsku*, "Belaruski histarychny chasopis" 2013, № 7, s. 4–14.

Волкаў М., *Архітэктура Старога замка часоў Вітаўта ў Гародні*, "Беларускі гістарычны часопіс" 2014, № 2, с. 17–34 / Volkaŭ M., *Arkhitėktura Staroha zamka chasoŭ Vitaŭta ŭ Harodni*, "Belaruski histarychny chasopis" 2014, № 2, s. 17–34.

Волкаў М.А., *Арсеналы замкаў у Беларускім Падзвінні ў XVI–XVII стст.*, в: *Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі: матэрыялы VIII Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Полацк, 1–2 лістапада 2022 г.)*, Полацк 2022, с. 67–82 / Volkaŭ M.A., *Arsenaly zamkaŭ u Belaruskim Padzvinni ŭ XVI–XVII stst.*, v: *Historyi͡a i arkhealohii͡a Polatska i Polatskaĭ zi͡amli: matėryi͡aly VIII Mizhnarodnaĭ navukova-praktychnaĭ kanferėntsyi (Polatsk, 1–2 listapada 2022 h.)*, Polatsk 2022, s. 67–82.

*Гістарычны слоўнік беларускай мовы*, т. 3: *Варыво–Вкупе*, Мінск 1983 / *Histarychny sloŭnik belaruskaĭ movy*, t. 3: Varivo–Vkupe, Minsk 1983.

Калядзінскі Л.У., *Віцебскі храм Св. Міхаіла*, "Весці Акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук" 1995, № 1, с. 59–65 / Kali͡adzinski L.U., *Vitsebski khram Sv. Mikhaila*, "Vestsi Akadėmii navuk Belarusi. Seryi͡a humanitarnykh navuk" 1995, № 1, s. 59–65.

Карпачев А.М., *Русские переписные книги как источник для демографического изучения городов Белоруссии второй половины XVII в.*, в: *Вопросы архивоведения и источниковедения в БССР*, Минск 1971, с. 324 / Karpachev A.M., *Russkie perepisnye knigi kak istochnik dli͡a demograficheskogo izuchenii͡a gorodov Belorussii vtoroĭ poloviny XVII v.*, v: *Voprosy arkhivovedenii͡a i istochnikovedenii͡a v BSSR*, Minsk 1971, s. 324.

Ковалец Т.Р., *Узброены канфлікт запарожцаў і віцяблян ў пачатку XVII ст.*, "Ученые записки УО «ВГУ им. П.М. Машерова». Сборник научных трудов" 22, 2016, с. 61–69 / Kovalets T.R., *Uzbroeny kanflikt zaparoz͡htsaŭ i vitsi͡abli͡an ŭ pachatku XVII st.*, "Uchenye zapiski UO «VHU im. P.M. Masherova». Sbornik nauchnykh trudov" 22, 2016, s. 61–69.

Колединский Л.В., *Верхний замок Витебска – уникальный археологический объект (изучение и сохранение)*, "Беларуская думка" 2022, № 6, с. 85–91 / Koledinskiĭ L.V., *Verkhniĭ zamok Vitebska – unikal'nyĭ arkheolohicheskiĭ obʺekt (izuchenie i sokhranenie)*, "Belaruskai͡a dumka" 2022, № 6, s. 85–91.

Колединский Л.В., *Верхний замок Витебска (IX–XVIII вв.)*, Гродно 2021 / Koledinskiĭ L.V., *Verkhniĭ zamok Vitebska (IX–XVIII vv.)*, Grodno 2021.

Краснянскі У.Г., *"Чарцёж" места Віцебска 1664 года як дакументальны помнік да гісторыі беларускага драўлянага будаўніцтва*, Менск 1928 / Krasni͡anski U.H., *"CHartsi͡oz͡h" mesta Vitsebska 1664 hoda i͡ak dakumental'ny pomnik da historyi belaruskaha draŭli͡anaha budaŭnitstva*, Mensk 1928.

Кром М.М., *Меж Русью и Литвой. Пограничные земли в системе русско-литовских отношений конца XV – первой трети XVI в.*, Москва 2010 / Krom M.M., *Mezh Rus'i͡u i Litvoĭ. Pogranichnye zemli v sisteme russko-litovskikh otnosheniĭ kont͡sa XV – pervoĭ treti XVI v.*, Moskva 2010.

Левко О.Н., *Витебск*, Минск 2010 / Levko O.N., *Vitebsk*, Minsk 2010.

Левко О.Н., *Границы Верхнего и Нижнего замков на современном плане города Витебска по архивно-археологическим исследованиям*, "Матэрыялы па археалогіі Беларусі" 2019, № 30, с. 111–132 / Levko O.N., *Granit͡sy Verkhnego i Nizhnego zamkov na sovremennom plane goroda Vitebska po arkhivno-arkheologicheskim issledovanii͡am*, "Matėryi͡aly pa arkhealohii Belarusi" 2019, № 30, s. 111–132.

Лобин А.Н., *Оборона Опочки 1517: Бесова деревня против армии Константина Острожского*, Москва 2017 / Lobin A.N., *Oborona Opochki 1517: Besova derevni͡a protiv armii Konstantina Ostrozhskogo*, Moskva 2017.

Макараў М.Дз., *Ад пасада да магдэбургіі. Прававое становішча насельніцтва местаў Беларускага Падзвіння ў XIV – першай палове XVII ст.*, Мінск 2008 / Makaraŭ M.Dz., *Ad pasada da mahdėburhii. Pravavoe stanovishcha nasel'nitstva mestaŭ Belaruskaha Padzvinni͡a ŭ XIV – pershaĭ palove XVII st.*, Minsk 2008.

Макараў М., *Да пытання пра выкарыстанне тэрміну "данжон" (donjon) у беларускай гістарычнай літаратуры*, "Гістарычны альманах" 5, 2001, с. 54–67 / Makaraŭ M., *Da pytanni͡a pra vykarystanne tėrminu "danz͡hon" (donjon) u belaruskaĭ histarychnaĭ litaratury*, "Histarychny al'manakh" 5, 2001, s. 54–67.

Макараў М.Д., *Рынкавая плошча Віцебска ў другой палове XVI – пачатку XVIII ст.*, "Архіварыус" 20, 2022, с. 146–166 / Makaraŭ M.D., *Rynkavai͡a ploshcha Vitsebska ŭ druhoĭ palove XVI – pachatku XVIII st.*, "Arkhivaryus" 20, 2022, s. 146–166.

Макараў М.Д., Волкаў М.А., *Інвентар замка і горада Віцебска 1638 г.*, „Архіварыус" 18, 2020, с. 28–58 / Makaraŭ M.D., Volkaŭ M.A., *Inventar zamka i horada Vitsebska 1638 h.*, „Arkhivaryus" 18, 2020, s. 28–58.

Полехов С.В., *Наследники Витовта. Династическая война в Великом княжестве Литовском в 30-е годы XV века*, Москва 2015 / Polekhov S.V., *Nasledniki Vitovta. Dinasticheskai͡a voĭna v Velikom kni͡azhestve Litovskom v 30-e gody XV veka*, Moskva 2015.

Сапунов А.П., *Исторические сведения о витебских замках*, в: *Памятная книжка Витебской губернии на 1881 год*, Витебск 1881, с. 143–176 / Sapunov A.P., *Istoricheskie svedenii͡a o vitebskikh zamkakh*, v: *Pami͡atnai͡a knizhka Vitebskoĭ gubernii na 1881 god*, Vitebsk 1881, s. 143–176.

Сапунов А.П., *"Чертеж" гор. Витебска 1664 года*, Витебск 1910 / Sapunov A.P., *"Chertezh" gor. Vitebska 1664 goda*, Vitebsk 1910.

Сапунов А., Друцкий-Любецкий В., *Материалы по истории и географии Дисненского и Вилейского уездов Виленской губернии*, Витебск 1896 / Sapunov A., Drut͡skiĭ-Li͡ubet͡skiĭ V., *Materialy po istorii i geografii Disnenskogo i Vileĭskogo uezdov Vilenskoĭ gubernii*, Vitebsk 1896.

Тихомиров М.Н., *Список русских городов дальних и ближних*, "Исторические записки" 40, 1952, с. 214–259 / Tikhomirov M.N., *Spisok russkikh gorodov dal'nikh i blizhnikh*, "Istoricheskie zapiski" 40, 1952, s. 214–259.

Ткачев М.А., *Белорусский феодальный город XIV–XVIII веков (структура и организация обороны)*, диссертация на соискание ученой степени доктора исторических наук, Гродно 1985 / Tkachev M.A., *Belorusskiĭ feodal'nyĭ gorod XIV–XVIII vekov (struktura i organizat͡sii͡a oborony)*, dissertat͡sii͡a na soiskanie uchenoĭ stepeni doktora istoricheskikh nauk, Grodno 1985.

Ткачев М.А., *Замки Белоруссии*, Минск 1987 / Tkachev M.A., *Zamki Belorussii*, Minsk 1987.

Ткачоў М.А., *Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII–XVIII стст.*, Мінск 1978 / Tkachoŭ M.A., A*baronchyi͡a zbudavanni zakhodnikh zi͡amel Belarusi XIII–XVIII stst.*, Minsk 1978.

Ткачоў М.А., Бубенька Т.С., *Да пытання аб каменных умацаваннях Дольняга замка Віцебска*, в: *Гістарычна-археалагічны зборнік. Памяці М. Ткачова*, ч. 2, Мінск 1993, с. 153–161 / Tkachoŭ M.A., Buben'ka T.S., *Da pytanni͡a ab kamennykh umatsavanni͡akh Dol'ni͡aha zamka Vitsebska*, v: *Histarychna-arkhealahichny zbornik. Pami͡atsi M. Tkachova*, ch. 2, Minsk 1993, s. 153–161.

Чантурия Ю.В., *Белорусское градостроительное искусство: средневековое наследие, ренессанс, барокко, классицизм в системе европейского зодчества,* Минск 2017 / Chanturii͡a I͡U.V., *Belorusskoe gradostroitel'noe iskusstvo: srednevekovoe nasledie, renessans, barokko, klassit͡sizm v sisteme evropeĭskogo zodchestva*, Minsk 2017.

Шостьин Н.А., *Очерки истории русской метрологии: XI – начало XX века*, Москва 1975 / Shost'in N.A., *Ocherki istorii russkoĭ metrologii: XI – nachalo XX veka*, Moskva 1975.

Якимович Ю.А., *Зодчество Белоруссии XVI – середины XVII в.: справочное пособие*, Минск 1991 / I͡akimovich I͡u.A., *Zodchestvo Belorussii XVI – serediny XVII v.: spravochnoe posobie*, Minsk 1991.

**Мікола Волкаў (Mikola Volkau)** – кандыдат гістарычных навук. З'яўляецца аўтарам кніг: *Артылерыя Нясвіжскага замка* (Мінск 2015), *Слуцк на старых планах* (Мінск 2017) і *Замкі і фартэцыі Радзівілаў на беларускіх землях у XVI – пачатку XVIII ст.* (Мінск 2020). Займаецца гісторыяй абарончай архітэктуры, ваеннай справы, урбаністыкі і дарог у Вялікім Княстве Літоўскім. E-mail: mikola.volkau@gmail.com

**Максім Макараў (Maksim Makarau)** – доктар гуманістычных навук у галіне гісторыі. З'яўляецца аўтарам кніг: *Ад пасада да магдэбургіі. Прававое становішча насельніцтва местаў Беларускага Падзвіння ў XIV – першай палове XVII ст.* (Мінск 2008) і *Месцкія ўлады Полацка (1580–1772 гг.). Арганізацыя, персанальны склад* (Смаленск 2014). Займаецца гісторыяй гарадскога права ва Усходняй Еўропе, сацыяльна-палітычнай гісторыяй гарадоў Вялікага Княства Літоўскага XIV–XVIII стст. E-mail: makaraumaksim@gmail.com